Зніжаем выкіды парніковых газаў

СТАР.2

Палехскія іконы для мінскага храма

СТАР.4

Бацькі называлі яго Айбаліт

СТАР.4

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 СНЕЖНЯ 2014 г. СУБОТА № 232 (27842) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ДЗЕЦІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЖАДАНЫМІ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўхваліў рашэнне аб увядзенні з 1 студзеня 2015 года сямейнага капіталу ў памеры $10 тысяч пры нараджэнні трэцяга або наступных дзяцей

Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на сустрэчы з міністрам працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Марыянай Шчоткінай, паведамляе БЕЛТА.

«Мы вызначыліся, што для нас гэта найважнейшая праблема. Насельніцтва ў Беларусі павінна прырастаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнту быў прадстаўлены праект указа па дзяржпадтрымцы сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, і стымуляванні нараджальнасці, распрацаваны з улікам заўваг і прапаноў, што абмяркоўваліся на адпаведнай нарадзе ў кіраўніка дзяржавы. Праектам указа адносна сямейнага капіталу прадугледжваецца аднаразовае прадастаўленне сем'ям безнаяўных грашовых сродкаў у памеры $10 тысяч пры нараджэнні трэцяга або наступных дзяцей. Права на сямейны капітал маюць грамадзяне Беларусі пры нараджэнні або ўсынаўленні трэцяга і наступных дзяцей, якія нарадзіліся з 1 студзеня 2015 года да 31 снежня 2019 года. Прызначэнне сямейнага капіталу будзе ажыццяўляцца пры звароце ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Права на зварот па прызначэнне сямейнага капіталу можа быць рэалізавана на працягу 6 месяцаў з дня нараджэння або ўсынаўлення трэцяга і наступных дзяцей. Права распараджэння сродкамі сямейнага капіталу настане праз 18 гадоў з даты нараджэння гэтага дзіцяці. Сродкі сямейнага капіталу сям'я зможа накіраваць на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне адукацыі, паслуг у сферы сацыяльнага абслугоўвання, аховы здароўя, фарміраванне накапляльнай пенсіі маці. Пры гэтым сродкі могуць быць выкарыстаны датэрмінова на атрыманне платных медыцынскіх паслуг. Сродкі сямейнага капіталу будуць размяшчацца на дэпазітарных рахунках грамадзян у ААТ «ААБ Беларусбанк».

Акрамя таго, праектам указа запланавана, што сем'ям, якія выхоўваюць двое або больш непаўналетніх дзяцей, будзе прадастаўляцца штомесячная дапамога ў памеры 50 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Мінпрацы і сацабароны, за два апошнія кварталы. Права на дапамогу будуць мець маці ці бацька (усынавіцель, апякун), якія выхоўваюць адначасова дзяцей ва ўзросце да трох гадоў і ад трох да 18 і маюць права на дапамогу па доглядзе дзіцяці да трох гадоў.

Пры прызначэнні дапамогі не будуць улічвацца дзеці, якія знаходзяцца ў дзіцячай інтэрнатнай установе, а таксама ўстанове адукацыі з кругласутачным рэжымам знаходжання. Акрамя таго, не будуць мець права на гэты від дзяржпадтрымкі бацькі, пазбаўленыя бацькоўскіх правоў, чые дзеці знаходзяцца на дзяржзабеспячэнні.

Маладым сем'ям з дваімі непаўналетнімі дзецьмі будзе зніжана да 5 працэнтаў стаўка за карыстанне льготным крэдытам на будаўніцтва жылля, запланавана праектам указа.

Марыяна Шчоткіна звярнула ўвагу на добрую тэндэнцыю: у 2013 годзе нарадзілася 56 тыс. дзяцей, якія з'яўляюцца першымі ў сям'і, і 62 тыс., якія з'яўляюцца другімі і наступнымі. «Хацелася б, каб сем'і раслі, — сказала Марыяна Шчоткіна, — кожная сям'я жадала б мець як мінімум дваіх дзяцей. Але, вядома, ставяцца пытанні аб набыцці жылля і падтрымцы з боку дзяржавы».

Як адзначыла Марыяна Шчоткіна, у Беларусі робіцца максімум для таго, каб падтрымаць сем'і з дзецьмі. «Заўсёды трэба памятаць аб тым, што нічога не бывае бясплатна. Усё каштуе пэўных грошай. Таму ствараюцца ўмовы, і меры падтрымкі будуць і далей прадугледжвацца», — сказала яна.

Паводле слоў міністра, у Беларусі будзе распрацоўвацца новая праграма дэмаграфічнай бяспекі на наступную пяцігодку. «Але самае галоўнае: сем'і павінны быць моцнымі, дзеці павінны быць жаданымі, і дзяцей трэба любіць», — сказала Марыяна Шчоткіна.

Прамая лінія

ХВАРОБА — НЕ ПРЫСУД

Самыя розныя пытанні, звязаныя з прафілактыкай і лячэннем дабраякасных і злаякасных пухлін, а таксама з арганізацыяй анкалагічнай дапамогі, можна будзе задаць падчас «прамой лініі» **галоўнаму ўрачу Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Уладзіміру Сцяпанавічу КАРАНІКУ**.

«Прамая лінія» адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **12 снежня, у пятніцу, з 12.00 да 13.00** па нумары **287 18 71**. Папярэднія пытанні можна пакінуць, пазваніўшы на нумар **287 18 29**.

КАЛІ ЗБЫВАЮЦЦА МАРЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:

«Трагічныя падзеі ва Украіне сталі каталізатарам беспрэцэдэнтнага за апошнія дзесяцігоддзі росту напружанасці ў Еўропе, абвастрэння супярэчнасцяў, якія назапашваліся. На іх фоне яшчэ больш відавочнымі сталі сістэмныя праблемы ў сферы бяспекі ў рэгіёне АБСЕ. Многія загаварылі аб вяртанні часоў «халоднай вайны». Сёння мы падышлі да небяспечнай рысы, за якой нас можа чакаць зусім не той свет, пра які марылі тыя, хто стаяў ля вытокаў Хельсінкскага працэсу. Беларусь лічыць неабходным сумесна зрабіць тэрміновыя і рашучыя захады, каб прадухіліць раскручванне спіралі ўзаемных абвінавачванняў, пагроз і санкцый.
Трэба адкінуць логіку канфрантацыі, вярнуцца ў рэчышча ўзаемапаважлівага, канструктыўнага дыялогу».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 06.12.2014 г.

Долар ЗША	10840,00	▲
Еўра	13410,00	▲
Рас. руб.	204,00	▼
Укр. грыўня	706,19	▼

■ Вышэйшая школа

Патрабуюцца ініцыятыўныя, крэатыўныя, адказныя

…але запіс у дыпломе зусім не гарантуе прафесійную кампетэнтнасць спецыяліста

Як знайсці на рынку працы нішу для ўладальнікаў дыпломаў магістраў? Як ліквідаваць разрыў паміж прапановай адукацыйных паслуг і попытам на іх і не дапусціць падзення якасці вышэйшай адукацыі? Адказы на гэтыя пытанні шукалі ўдзельнікі міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Вышэйшая тэхнічная адукацыя: праблемы і шляхі развіцця», якая прайшла на базе БДУІР і сабрала больш за 400 спецыялістаў з Беларусі, Украіны, Расіі, Славакіі, Туркменістана і ЗША.

ШТО ЗА КІДКАЙ НАЗВАЙ?

На сёння наменклатура спецыяльнасцяў I ступені вышэйшай адукацыі ўключае ў нашай краіне 384 найменні, а колькасць спецыялізацый і ўвогуле даходзіць да 717.

— Пералік спецыяльнасцяў пастаянна расце пры штогадовым змяншэнні колькасці абітурыентаў. Але ці расце пры гэтым разнастайнасць відаў эканамічнай дзейнасці? Такія даследаванні ў нас не выконваліся, хоць яны вельмі неабходныя, — дзеліцца сваім меркаваннем **начальнік Цэнтра бесперапыннай прафесійнай адукацыі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Вольга ОЛЕКС.** — З 2002 года, калі быў уведзены агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь «Спецыяльнасці і класіфікацыі», колькасць спецыяльнасцяў у сістэме аднаступенчатай вышэйшай адукацыі ўзрастала нязначна (ад 0,5 да 3% у год) і, што галоўнае, заканамерна — па меры росту патрэб эканомікі краіны і магчымасцяў ВНУ. Напрыклад, падрыхтоўку ваенных спецыялістаў па шэрагу традыцыйных для расійскіх вышэйшых навучальных устаноў спецыяльнасцяў распачала Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь.

СТАР.4

■ Прагноз

МІНУС 40 СЁЛЕТА НЕ ПЛАНУЕЦЦА

А НА НОВЫ ГОД — УВОГУЛЕ КАЛЯ 0

Айчынныя спецыялісты прагназуюць, што гэтая зіма будзе халаднейшай за папярэднюю, якая была анамальна цёплай, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў беларускіх сіноптыкаў, тэмпература паветра ў снежні будзе адпавядаць кліматычнай норме, характэрнай для першага месяца зімы (мінус 5–7 градусаў). Разам з тым для снежня, які лічыцца пераходным перыядам, будзе характэрны няўстойлівы характар надвор'я. Калі на працягу мінулага тыдня тэрыторыя Беларусі была пад уплывам халодных антыцыклонаў, якія абумовілі марознае надвор'е, то ўжо на выхадныя і далей чакаецца пацяпленне і стане больш вільготна, удакладніў гэты прагноз наш эксперт.

СТАР.3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Арменія зрабіла яшчэ крок да ЕАЭС



Парламент Арменіі ратыфікаваў дамову аб далучэнні рэспублікі да Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС). За адпаведнае рашэнне прагаласавалі 103 дэпутаты, супраць — 7. Яшчэ адзін парламентарый устрымаўся. Ратыфікацыю падтрымалі ўсе сілы, прадстаўленыя ў заканадаўчым органе краіны, акрамя апазіцыйнай фракцыі «Спадчына». Дакумент аб далучэнні Арменіі да ЕАЭС быў падпісаны ў Мінску 10 кастрычніка.

Чарговыя перагаворы па спыненні агню на ўсходзе Украіны

На 9 снежня запланавана сустрэча прадстаўнікоў Аб'яднанага цэнтра па спыненні агню на ўсходзе Украіны. Пра гэта паведаміў на брыфінгу прадстаўнік Савета нацыянальнай бяспекі і абароны Украіны (СНБА) Андрэй Лысенка. «Гэта будзе «лакмусавы дзень», каб зразумець, хто і наколькі гатовы выконваць мінскія дамоўленасці», — сказаў ён. Раней Парашэнка абвясціў аб увядзенні ўкраінскімі сілавікамі «Дня цішыні» (рэжым поўнага спынення агню) на паўднёвым усходзе краіны, які павінен пачацца 9 снежня. Па словах Лысенкі, «Украіна гатовая забяспечыць «Дзень цішыні» і выконваць мінскія дамоўленасці». «Як толькі цэлы дзень будзе падтрыманне цішыні, гэта будзе старт для выканання мінскіх дамоўленасцяў: пачатку адводу цяжкага ўзбраення на 15 км і далей, вызвалення заложнікаў, зняцця мінных загарод, наступнага вываду ўзбраенняў і дэмілітарызацыі рэгіёна», — сказаў спікер СНБА.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Расія падпісала са Славакіяй «нафтавы» дагавор

Міністр энергетыкі Расіі Аляксандр Новак і міністр прамысловасці Славакіі Павал Паўліс падпісалі доўгатэрміновы дагавор аб пастаўках расійскай нафты ў Славакію і яе транзіце ў еўрапейскія краіны, паведамляюць інфармагенцтвы.



Дагавор заключаны тэрмінам на 15 гадоў — са студзеня 2015 года да канца 2029 з наступнай аўтаматычнай пралангацыяй на кожныя пяць гадоў, калі не будзе пярэчанняў бакоў. Дакумент прадугледжвае штогадовыя пастаўкі з Расіі ў Славакію да 6 млн т нафты па трубаправодзе «Дружба», такі ж аб'ём сыравіны пойдзе транзітам праз славацкую тэрыторыю ў трэція краіны.

Тэрмін папярэдняга дагавора, заключанага яшчэ ў 1991 годзе, заканчваецца 31 снежня.

КАРОТКА

Указамі Прэзідэнта Беларусі першай і другой заставам 15-й групы органаў пагранслужбы прысвоены імёны «Астравецкая» і «Маладзечанская».

У Мінску з 12 снежня 2014 года па 15 студзеня 2015 года разгорнецца «Калядны кірмаш». Кірмашовыя рады будуць працаваць на Кастрычніцкай плошчы і каля Палаца спорту штодзённа з 12.00 да 21.00. Дарэчы, кірмаш каля Палаца спорту не спыніць сваю работу і ў навагоднюю ноч. Набыць тавар тут можна будзе з 21.00 31 снежня да 4.00 1 студзеня.

Беларусь увяла часовую забарону на вываз са сваёй тэрыторыі рэгенерыруемых паперы або кардону (макулатуры і адходаў). Забарона прадоўжыцца да 1 чэрвеня 2015 года.

Самымі шчодрымі ў Беларусі з'яўляюцца турысты з Расіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Турцыі.

Па цудоўнай традыцыі, закладзенай у 2010 годзе, у ноч з 13 на 14 студзеня галоўны тэатр краіны — Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі — запрашае сустрэць стары Новы год у сваіх сценах. Імпрэза пачнецца 13 студзеня ў 20.30 і завершыцца 14 студзеня ў 3.00.

Кіраўнік МЗС Украіны Павел Клімкін пацвердзіў, што падрыхтоўка да новай сустрэчы ў мінскім фармаце прадаўжаецца. Міністр не выключыў, што такая сустрэча можа адбыцца «ў самы бліжэйшы час».

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

«БО ЯНА НАСАМРЭЧ РОДНАЯ!»

Алена ПАНЦЮХОВА, дырэктар Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства радыётэлецэнтр «Тэлерадыёкампанія «Віцебск»:

— Шчыра прызнаюся, калі ўзначаліла калектыў «Тэлерадыёкампаніі «Віцебск», часу, каб пачытаць газеты, бывае вельмі мала. Але стараюся з самай раніцы прагартаць свежыя нумары рэспубліканскіх, абласнога і гарадскога выданняў. Было вельмі прыемна, што мая любімая газета «Звязда» паведаміла пра тое, што ў нашай краіне запрацаваў у эфіры першы абласны тэлеканал «Віцебск». Гэта стала магчымым дзякуючы падтрымцы старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандра Мікалаевіча Косінца. У эфіры мы штодня вясчаем больш за 17 гадзін. Выпускі навін, якія, дарэчы, выходзяць кожную гадзіну, робім на беларускай мове. Спрабуем працаваць на роднай мове і ў прамым эфіры. Думаю, гэта вельмі важна.

«Звязда» для мяне насамрэч «родная газета на роднай мове». Я — беларуска, ганаруся тым, што вучылася на факультэце беларускай філалогіі і гісторыі Віцебскага педагагічнага інстытута імя П. М. Машэрава. Чытала «Звязду», калі яшчэ была студэнткай. У газеце мне падабаліся артыкулы, прысвечаныя гісторыі Беларусі, а таксама краязнаўчыя, разважанні наконт таго, што нельга здраджваць роднай мове. Гэта насамрэч так і ёсць.

З задавальненнем іграла ў студэнцкім тэатры. Дарэчы, рэжысёр Уладзімір Сівіцкі, які працаваў на абласной студыі тэлебачання, разам з іншымі студэнтамі, запрасіў мяне на кастынг, які я паспяхова прайшла… Працавала карэспандэнтам у аддзеле навін, потым узначаліла карэспандэнцкі пункт па Віцебскай вобласці Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі. Канешне, каб быць у курсе падзей, абавязкова чытала газеты. І «Звязда» перыядычна прыемна здзіўляла мяне цікавымі публікацыямі. Некаторыя дапамагалі рабіць сюжэты.

Лічу, што ў час актыўнага карыстання інтэрнэтам газетам не трэба «гнацца за навінамі», тым больш што і па тэлебачанні іх агучыць хутчэй. «Звязда» робіць стаўку на цікавыя артыкулы. Вельмі добра чытаюцца рэпартажы з рэгіёнаў, інтэрв'ю з цікавымі людзьмі, якія жывуць у глыбінцы. У «Звяздзе» мне падабаюцца ўкладкі: «Сямейная газета», «Ігуменскі тракт», «Усё пра Еву».

Запісаў Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на I паўгоддзе 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

УВАГА! Толькі з 1 па 15 снежня пры падпісцы ў аддзяленнях РУП "Белпошта" ці ў паштальёнаў цана на месяц для індывідуальных падпісчыкаў — 56 150 беларускіх рублёў.

Індэкс/перыяд	1 месяц	3 месяцы	6 месяцаў
63850 (для індывідуальных падпісчыкаў)	60 000	180 000	360 000
63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў)	54 000	162 000	324 000
63858 (для ведамасных падпісчыкаў)	140 000	420 000	840 000
63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя)	126 500	378 000	756 000

МЯЖА ПАД НАДЗЕЙНАЙ АХОВАЙ

Пытанні пагранічнай бяспекі абмеркаваны ў час даклада Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Леаніда Мальцава, паведамляе БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ведае праблемы пагранічнай службы знутры, і нагадаў, што ў свой час быў прааналізаваны шэраг актуальных пытанняў, якія стаяць перад ведамствам. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся таксама перспектыўнымі напрамкамі ўладкавання інфраструктуры мяжы. Пры гэтым ён перасцярог ад увязвання ў сумніўныя праекты. «Вось я ніяк не магу прывыкнуць да гэтых вашых беспілотнікаў. Калі яны даюць эфект і вы за кошт гэтага менш сродкаў расходуеце на ахову мяжы, больш выяўляеце парушальнікаў — калі ласка, няхай гэта сучаснае будзе, але не дай Бог мы няправільным шляхам пойдзем — вось гэтага дапусціць нельга», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«І вельмі важнае пытанне — украінская мяжа. Мы дамаўляліся, што нам трэба сур'ёзна весці работы на ёй у плане дэмаркацыі. Украінскія сябры не могуць на нас пакрыўдзіцца, таму што не мы былі ініцыятарамі, яны гэтага захацелі, яны гэтую работу пачалі, мы вымушаны былі таксама пачаць. Як яны працуюць, як мы працуем і што наогул адбываецца на ўкраінскай мяжы, наколькі яна можа нас сёння насцярожваць, хваляваць?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Старшыня Дзяржпагранкамітэта далажыў, што стан пагранічнай бяспекі краіны ацэньваецца як стабільны. Органы пагранічнай службы выконваюць свае задачы ў штатным рэжыме. У напружаным і дынамічным стане знаходзяцца пункты пропуску напярэдадні калядных і навагодніх свят. Аднак Леанід Мальцаў запэўніў, што Дзяржпагранкамітэт гатовы да любых змен сітуацыі.

Што датычыцца даручэнняў Прэзідэнта па забеспячэнні надзейнай пагранічнай бяспекі краіны, то яны выконваюцца ў поўным аб'ёме ў вызначаныя тэрміны і якасна. У прыватнасці, аптымізавана арганізацыйна-штатная структура, што дало магчымасць узмацніць ахову дзяржаўнай мяжы, у тым ліку на паўднёвым напрамку, разгарнуць дадатковыя заставы, пагранічныя пасты. Разгорнуты дзве заставы для ўзмацнення аховы ў напрамку атамнай электрастанцыі, завяршаецца разгортванне новага пагранічнага атрада ў Мазыры.

Акрамя таго, сур'ёзна павышаны ўзровень інжынернага абсталявання дзяржаўнай мяжы, у першую чаргу на паўднёвым напрамку, а таксама на літоўскім і латышскім участках. Леанід Мальцаў далажыў, што працягваюцца работы па ўкараненні электроннай чаргі ў пунктах пропуску. Адначасова завяршаецца распрацоўка праекта ўказа, які дасць магчымасць стварыць прававое поле для ўкаранення электроннай чаргі.

ПРЫНЯТЫ БЮДЖЭТ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ НА БУДУЧЫ ГОД

УЧОРА АДБЫЛАСЯ 47-Я СЕСІЯ ПАРЛАМЕНЦКАГА СХОДУ САЮЗА БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Дэпутаты ў другім чытанні прынялі саюзны бюджэт на 2015 год у памеры амаль 4,9 млрд расійскіх рублёў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Праект дэкрэта Вышэйшага дзяржаўнага савета «Аб бюджэце Саюзнай дзяржавы на 2015 год» паступіў у Парламенцкі сход 10 лістапада 2014 года. У адпаведнасці з ім аб'ёмы адлічэнняў дзяржаў-удзельніц складаюць 4,872 млрд расійскіх рублёў, з якіх 3,167 млрд прыпадае на адлічэнні Расіяй і 1,705 млрд — на адлічэнні Беларуссю.

«У 2015 годзе каля 85% агульных выдаткаў бюджэту прапануецца накіраваць на выкананне 9 саюзных праграм і 28 мерапрыемстваў, у тым ліку ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, энергетыкі, транспарту, сувязі і інфарматыкі — будзе выкарыстана 42% бюджэту; на сацыяльную палітыку, ахову здароўя, адукацыю, экалогію, культуру і СМІ — 26%; ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва, праваахоўную дзейнасць, забеспячэнне бяспекі — 17%. Расходы на ўтрыманне органаў Саюзнай дзяржавы складуць менш за 10% ад агульнага аб'ёму расходнай часткі бюджэту», — сказаў дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота.

Сярод 9 саюзных праграм — «Распрацоўка касмічных і наземных сродкаў забеспячэння спажыўцоў Расіі і Беларусі інфармацыяй дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі на аснове высокіх тэхналогій», «Інавацыйнае развіццё вытворчасці бульбы і тапінамбура на 2013–2016 гады», «Умацаванне памежнай бяспекі Саюзнай дзяржавы на перыяд 2012–2016 гадоў», «Удасканаленне сістэмы абароны агульных інфармацыйных рэсурсаў Беларусі і Расіі на аснове высокіх тэхналогій», «Сумесная дзейнасць па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў рамках Саюзнай дзяржавы да 2016 года».

Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі ў 2015 годзе зробіць стаўку на пашырэнне рэгіянальнага супрацоўніцтва паміж краінамі для вырашэння эканамічных праблем, заявіў падчас работы сесіі намеснік старшыні Парламенцкага сходу Іван Мельнікаў, прадстаўляючы план-графік работы сходу на 2015 год.

«Па аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах эканоміка краін знаходзіцца перад новымі выклікамі, і будучы год будзе нялёгкім. Адно з рашэнняў праблемы — пашырэнне сацыяльна-эканамічнага супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі. Пытанні рэгіянальнага супрацоўніцтва будуць прыярытэтнымі ў парадку дня нашых мерапрыемстваў, дзе б яны ні праходзілі», — сказаў Іван Мельнікаў.

У 2015 годзе будзе адзначацца 70-годдзе Вялікай Перамогі. «У нас адзінае разуменне цаны гэтай Перамогі. Відавочна, што пры правядзенні мерапрыемстваў Парламенцкага сходу будзе правільным наведваць воінскія мемарыялы, арганізоўваць ускладанне кветак, аддаваць наш доўг памяці загінулым воінам», — дадаў намеснік старшыні.

Паводле слоў Івана Мельнікава, у надыходзячым годзе спатрэбіцца цесная каардынацыя сумеснай работы парламентаў Беларусі і Расіі. Актыўны ўдзел саюзных дэпутатаў у мерапрыемствах нацыянальных парламентаў павінен стаць правілам.

Акрамя таго, парламентарыі Саюзнай дзяржавы ў 2015 годзе плануюць устанавіць адносіны з Міжпарламенцкай асамблеяй Асацыяцыі краін Паўднёва-Усходняй Азіі. Таксама дэпутаты працягнуць практыку ўдзелу ў міжнародным назіранні за выбарамі ў вышэйшыя органы ўлады замежных краін.

Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі прыняў таксама дэкрэт «Аб парадку фарміравання і выканання бюджэту Саюзнай дзяржавы». Новая рэдакцыя дакумента распрацавана з улікам шматгадовага вопыту арганізацыі бюджэтнага працэсу ў Саюзнай дзяржаве. Яна павінна працаваць у плане ліквідацыі недахопаў, якія выявіліся ў гэтай сферы, а таксама замацаваць механізмы ажыццяўлення бюджэтнага працэсу, што апраўдалі сябе на практыцы.

■ На думку дэпутата

Парламентарый Мікалай Іванчанка, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, старшыня міжведамаснай працоўнай групы па каардынацыі дзейнасці, звязанай з пытаннямі харчавання насельніцтва, выказаў сваю думку наконт сённяшняй сітуацыі ў сферы беларуска-расійскага гандлю.

Трэба мець інструмент сустрэчных дзеянняў

— Дзеянні расійскага боку, нелагічныя нават у элементарным, — заўважыў дэпутат. — Забаронена пастаўка мяса птушкі ад нашых буйных птушкафабрык. Але ж там няма афрыканскай чумы свіней, да таго ж створана каласальная сістэма кантролю, звязаная з паступленнем сыравіны, яе перапрацоўкай, выпускам прадукцыі.

Мікалай Іванчанка лічыць, што ў сувязі з сітуацыяй з эмбарга на прадукцыю некаторых нашых прадпрыемстваў, якая склалася ў Расіі, такія дзеянні некаму «на руку».

— Нехта хоча пагрэць рукі за кошт павышэння цэн на гэту прадукцыю, — адзначыў дэпутат.

Мікалай Іванчанка лічыць, што са свайго боку нашай краіне трэба больш агрэсіўна выкарыстоўваць свае кантрольныя магчымасці па сустрэчным імпарце.

— Мы атрымліваем праз Расію не толькі прамысловыя тавары, да нас прыходзяць і харчовыя. Таму мы павінны граматна, аргументавана і вельмі пільна прыгледзецца да іх якасці. Тым больш што калі выкарыстоўваць нашу інструментальную базу пры праверках, то мы таксама можам знайсці нейкія значныя або нязначныя адхіленні, якія могуць стаць сур'ёзным інструментам для сустрэчных спрэчак.

Дэпутат упэўнены, што мы павінны заўсёды мець у руках інструмент нейкіх сустрэчных дзеянняў, на той выпадак, калі здараюцца такія сур'ёзныя рэчы, звязаныя з забаронай нашай прадукцыі.

— Гэта ўвогуле непрыгожа ў той сітуацыі, калі мы толькі што ратыфікавалі дагавор аб стварэнні нашага саюза — пакуль трох дзяржаў, у хуткім часе да яго далучацца яшчэ дзве, — заявіў парламентарый. — Яшчэ не высахла чарніла на подпісах, а ўжо пачынаюцца такія вось дзеянні.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■ Энергетычная бяспека

БелАЭС: ТАННЕЙШАЯ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ — ЧЫСЦЕЙШАЕ ПАВЕТРА

Праз 5 гадоў нашай краіне неабходна дасягнуць зніжэння выкідаў вуглякіслага газу і дыяксіду азоту на 15% да ўзроўню 2010 года

Ва ўсім свеце зніжэнне выкідаў парніковых газаў — задача глабальная, і Беларусь тут не выключэнне. Аднак выконваць падобныя задачы трэба з розумам. Проста пазакрываць старыя электрастанцыі на вугалі ці мазуце нерэальна. Магчыма, што дапамагчы выканаць нацыянальную праграму па выкідах зможа будучая атамная станцыя. Менавіта тэме атамнай энергетыкі была прысвечана анлайн-канферэнцыя з беларускімі экспертамі на сайце БЕЛТА.

Цалкам адмовіцца ад імпарту

У першую чаргу звычайных людзей цікавіць пытанне кошту гэтай самай электрычнасці. І сапраўды, наколькі падаражэюць або патаннеюць тарыфы на энергію пасля ўвода ў эксплуатацыю нашай атамнай электрастанцыі? **Начальнік упраўлення энергаэфектыўнасці Міністэрства энергетыкі Беларусі Міхаіл МАЛАШЭНКА** лічыць, што ўвод БелАЭС прывядзе да загрузкі найбольш эфектыўнага існуючага абсталявання энергасістэмы з меншым удзельным выдаткам на выпрацоўку электрычнай энергіі. Сабекошт кілават-гадзіны на Беларускай АЭС будзе істотна ніжэйшы, чым той электраэнергіі, якая выпрацоўваецца намі цяпер. Натуральна, што з уводам у эксплуатацыю БелАЭС энергетычны прадукт для спажыўца будзе таннець, бо ў сваім балансе, пачынаючы з 2018 года, мы цалкам адмовімся ад імпарту электрычнай энергіі.

Колькасць прыхільнікаў развіцця ядзернай энергетыкі ў краіне выросла з 28,3% у 2005 годзе да 49,8% у 2014-м.

У перспектыве (пры спрыяльных геапалітычных умовах) мы зможам пастаўляць электраэнергію ў краіны блізкага і далёкага замежжа. І гэта адаб'ецца на сабекошце канчатковага прадукту для айчынных спажыўцоў — як рэальнага сектара, так і фізічных асоб, упэўнены спецыяліст. Атрымліваецца, што праз пэўны час ад работы нашай «атамкі» выйграем усе мы.

Эканомія 5 млрд кубаметраў газу

Са спажыўцамі зразумела. А ў чым рэальныя плюсы для эканомікі і экалогіі Беларусі ад будаўніцтва атамнай станцыі? Самае галоўнае ў тым, што атамная станцыя з'яўляецца найбольш экалагічна чыстай у параўнанні са станцыямі, якія працуюць на прыродным газе, паколькі выкідаў абсалютна няма, расказвае **начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва, падрыхтоўкі кадраў і інфармацыйнага забеспячэння Дэпартамента па ядзернай энергетыцы Беларусі Лілія ДУЛІНЕЦ.** Што да эканомікі, то яна прадугледжвае замену каля 5 млрд кубічных метраў прыроднага газу штогод. Структура выдаткаў на вытворчасць электраэнергіі ў атамнай энергетыцы істотна адрозніваецца, паколькі сабекошт атамнай энергіі вызначаецца ў асноўным капітальнымі ўкладаннямі ў будаўніцтва АЭС, а не паліўнымі выдаткамі. Так, у сабекошце кілават-гадзіны электраэнергіі на станцыях, якія працуюць на прыродным газе, паліўны складнік мае больш за 75%, а на атамных ён не перавышае 20%. Прычым выдаткі на прыродны ўран знаходзяцца ў межах 5–7%. Таму рост коштаў на прыродны ўран і ядзернае паліва ў значна меншай ступені ўплываюць на кошт выпрацаванай электраэнергіі.

Што ж тычыцца экалагічнага аспекту ўплыву АЭС, то з усіх тэхналогій вытворчасці электраэнергіі, якія дзейнічаюць сёння, толькі атамная энергетыка здольная забяспечыць устойлівае развіццё без вычэрпвання эканамічных і экалагічных рэсурсаў, а таксама супрацьстаяць глабальным кліматычным зменам на планеце, так званаму парніковаму эфекту.

Зніжаем выкіды парніковых газаў

У нядаўна распаўсюджанай заяве Міністэрства эканомікі, гандлю і прамысловасці Японіі гаворыцца пра тое, што ў краіне рэзка ўзраслі выкіды вуглякіслага газу. І звязана гэта з тым, што пасля аварыі на АЭС «Фукусіма-1» усе 48 атамных рэактараў былі заглушаны і на змену ядзернаму паліву ў якасці энерганосьбітаў прыйшлі арганічныя віды паліва. Як лічаць іх эксперты, калі гэтыя АЭС адновяць працу, выкід парніковых газаў істотна зменшыцца. У сувязі з гэтым урад Японіі заявіў аб тым, што вяртанне да атамнай энергетыкі непазбежна, а некалькі станцый ужо рыхтуюцца да запуску.

Згодна з Дзяржаўнай праграмай развіцця беларускай энергетычнай сістэмы на перыяд да 2016 года, нам неабходна да 2020 года забяспечыць зніжэнне выкідаў вугляродзіслага газу і дыяксіду азоту не менш чым на 15% да ўзроўню 2010 года. Тут Міхаіл Малашэнка перакананы, што зніжэнне выкідаў забруджвальных рэчываў забяспечваецца за кошт укаранення найбольш эфектыўных сродкаў ачысткі выкідных газаў ад цвёрдых часцінак і дыяксіду серы, сучасных сродкаў зніжэння выкідаў аксіду азоту і дыяксіду вугляроду; выкарыстання аптымальных тэмпературна-цеплавых рэжымаў эксплуатацыі кацельнага абсталявання і ўдасканалення канструктыўных элементаў і гэдак далей.

Скарачэнне выкідаў парніковых газаў будзе забяспечвацца за кошт удасканалення арганізацыйна-эканамічнай палітыкі энергазберажэння; павышэння каэфіцыента карыснага выкарыстання энерганосьбітаў на ўсіх стадыях вытворчасці, транспартавання і спажывання; павелічэння ў паліўным балансе краіны аднаўляльных крыніц энергіі і другасных энергарэсурсаў.

Асноўны складнік эфекту па гэтым напрамку будзе дасягнуты за кошт укаранення экалагічна і эканамічна эфектыўных відаў абсталявання і тэхналогій, а таксама выцяснення арганічнага паліва з паліўнага балансу энергасістэмы за кошт уводу ў эксплуатацыю двух блокаў АЭС. Таксама з улікам укаранення парагазавых тэхналогій, надбудоў газатурбінных установак на існуючых аб'ектах і ўводу ў эксплуатацыю АЭС, да 2020 года прагназуецца двухразовае скарачэнне экалагічнай нагрузкі энергакрыніц энергасістэмы на навакольнае асяроддзе. Увод у эксплуатацыю двух блокаў сумарнай электрычнай магутнасцю 2400 мегават дазволіць замясціць каля 5 млрд кубаметраў імпартнага прыроднага газу. Адпаведна, на гэтую ж велічыню скароцяцца і цеплавыя выкіды ад спальвання газу, якія ўплываюць на рост парніковага эфекту.

Рэалізацыя захадаў, прадугледжаных дзяржпраграмай, дазволіла скараціць сумарныя выкіды забруджвальных рэчываў па сістэме «Белэнерга» з 45,3 тысячы тон у 2010 годзе да 33,3 тысячы тон у 2013-м. Выкіды аксідаў азоту скараціліся адпаведна з 27,7 тысячы тон да 23,6 тысячы тон. Праводзіцца актыўная праца па зніжэнні ўдзельных нормаў на выпрацоўку цеплавой электрычнай энергіі, зніжэння страт у электрычных цеплавых сетках. Тут краіна да 2016 года павінна знізіць страты на два працэнтныя пункты. Усё гэта пацягне за сабой памяншэнне выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра.

Самы чысты від энергіі

Кажуць, што вугальныя цеплавыя электрастанцыі ў некалькі разоў мацней забруджваюць навакольнае асяроддзе, чым АЭС.

Тэхнагеннае ўздзеянне на чалавека і навакольнае асяроддзе пры вытворчасці электраэнергіі несумненна прысутнічае, расказвае Лілія Дулінец. Цяпер наша задача — гэта ўздзеянне мінімізаваць. З гэтага пункту гледжання атамная энергетыка з'яўляецца самай экалагічна чыстай з усіх даступных сёння крыніц энергіі. Так, пры рабоце цеплавых электрастанцый, якія выкарыстоўваюць у якасці паліва мазут, каменны вугаль і прыродны газ, у навакольнае асяроддзе выкідваюцца наступныя забруджвальныя рэчывы: вугляродзіслы газ, які з'яўляецца асноўнай прычынай парніковага эфекту і выклікае глабальнае пацяпленне; дыяксід серы, які выклікае кіслотныя дажджы; аксіды азоту, якія раздражняюць нашы лёгкія і выклікаюць рэспіраторныя захворванні. Усе пералічаныя выкіды падчас работы АЭС адсутнічаюць.

Акрамя таго, электрастанцыя на каменным вугалі за год пакідае ў адвалах 250 тысяч тон нелятучага попелу і шлаку. Паколькі каменны вугаль з'яўляецца натуральна радыеактыўным з-за наяўнасці ў ім дамешак урану, то такая радыеактыўнасць трапіць потым і ў атмасферу.

АЭС, бясспрэчна, з'яўляецца найбольш экалагічна чыстай, а значыць пераважнай крыніцай энергіі на сённяшні дзень.

Спадарыня Дулінец паведаміла, што ў 2002 годзе Міжнароднае энергетычнае агенцтва правяло маштабнае даследаванне ўплыву розных відаў энергетыкі на жыццё і здароўе людзей. Улічвалася мноства параметраў, уздзеянне таго ці іншага паліва на ўсіх этапах яго жыццёвага цыклу — ад здабычы да ўтылізацыі, а таксама колькасць звязаных з электрагенерацыяй смерцяў, як у выніку няшчасных выпадкаў і аварый, так і з прычыны выкідаў шкодных рэчываў і радыяцыі. Вынік даследавання такі: самая бяскшкодная энергія — атамная, а больш за ўсё смерцяў у разліку на мегават вырабленай электрычнасці выклікае спальванне вугалю. Уся справа ў выкідах з вугальных электрастанцый. Дадаюць да статыстыкі звязаных з вугалем смерцяў і шматлікія аварыі на вугальных шахтах, а таксама забруджванне пры транспартаванні паліва. Такім чынам, АЭС, бясспрэчна, з'яўляецца найбольш экалагічна чыстай, а значыць пераважнай крыніцай энергіі на сённяшні дзень.

На гэты конт сваю думку выказаў **начальнік аддзела экспертызы прамысловых аб'ектаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Васіль КАВАЛЕНКА.** Паводле яго слоў, пры ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе быў праведзены аналіз альтэрнатыўных варыянтаў вытворчасці электраэнергіі. У справаздачы параўналі паказчыкі па выкідах ад газавых і вугальных кацельняў і тых, якія выкарыстоўваюць у якасці паліва мазут. Па выніках даследавання зроблена выснова, што ўздзеянне атамнай электрастанцыі на экалагічнае становішча з'яўляецца самым прымальным. Навакольнае асяроддзе забруджваюць толькі выкіды пускаладачнай кацельні на момант пускаладачных работ на атамнай электрастанцыі (каля 93 тон). Калі б працавала вугальная кацельня, то выкіды забруджвальных рэчываў склалі б каля 17 тысяч тон за год, а выкіды парніковых газаў — больш за 5 млн тон за год.

Бяспека новага пакалення

Зразумела, што нашай грамадскасці неабыякава, якім будзе першы ядзерны аб'ект у краіне. Асабліва ў плане яго бяспекі. **Намеснік генеральнага дырэктара «Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны» Аляксандр ТРЫФАНАЎ** адзначыў, што асаблівая ўвага пры праектаванні электрастанцыі надаецца сістэме бяспекі. Увогуле, у праектаванні існуе дзве крайнасці: амерыканскі варыянт, дзе ствараюцца чыста пасіўныя сістэмы бяспекі, і французскі, дзе выкарыстоўваюцца актыўныя сістэмы, якія патрабуюць падводу знешняй энергіі. У Беларусі будзе пабудавана атамная станцыя новага пакалення — расійскі праект «АЭС-2006» з рэактарамі тыпу ВВЭР пакалення «тры плюс», які цалкам адпавядае міжнародным нормам і рэкамендацыям МАГАТЭ. Аляксандр Трыфанаў упэўнены, што беларуская АЭС уяўляе сабой разумнае спалучэнне актыўнай і пасіўнай сістэм, якое павялічвае бяспеку станцыі. Перад пачаткам будаўніцтва экспертыза ядзернай радыяцыйнай бяспекі праводзіцца як вядучымі беларускімі спецыялістамі, так і экспертамі з МАГАТЭ.

Прыхільнікаў стала значна больш

Кіраўніцтва краіны і спецыялістаў энергетычнай галіны заўсёды цікавіла стаўленне грамадскасці да будаўніцтва атамнай станцыі ў Беларусі. Таму, паводле слоў Ліліі Дулінец, на заказ Мінэнерга інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, пачынаючы з 2005 года, рэгулярна праводзіць сацыялагічныя апытанні грамадскай думкі па пытаннях развіцця ядзернай энергетыкі і ўспрымання насельніцтвам будаўніцтва АЭС.

Апошнія вынікі сацапытання паказалі, што колькасць прыхільнікаў развіцця ядзернай энергетыкі ў краіне выросла з 28,3% у 2005 годзе да 49,8% у 2014-м, у той жа час колькасць праціўнікаў АЭС знізілася з 46,7% у 2005 годзе да 19,7% у 2014-м.

Зразумела, што вялікі ўплыў на грамадскую думку — не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце, аказала аварыя на АЭС «Фукусіма-1» у Японіі (у 2011 годзе). Пасля гэтай аварыі колькасць прыхільнікаў скарацілася, але цяпер гэтая крывая павольна, але ўпэўнена ідзе ўгору.

Прычым ні сама Японія, ні іншыя краіны не адмовіліся ад выкарыстання атамнай энергіі. Але ўрокі «Фукусімы» былі старанна вывучаны і прыняты неабходныя захады для недапушчэння падобных аварый у будучыні.

Сяргей КУРКАЧ

РЫБАКА ВЫРАТАВАЛІ СПЕЦНАЗАЎЦЫ

У Мінску на Свіслачы супрацоўнікі атрада міліцыі асаблівага прызначэння ГУУС выратавалі 81-гадовага рыбака, які праваліўся пад лёд.

Міліцыянеры ўдзень неслі службу па ахове грамадскага парадку ў сталічным парку Перамогі — патрулявалі набярэжную ракі, калі пачулі крыкі аб дапамозе, паведамляе прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама. Падбегшы да Свіслачы, яны ўбачылі ў 40 метрах ад берага чалавека, які тануў. Яго галава то з'яўлялася на паверхні, то знікала з віду... Міліцыянеры, скінуўшы бушлаты, кінуліся на дапамогу. Аднак адразу стала зразумела, што падбегчы да пацярпелага не атрымаецца: нетрывалы лёд пачаў прагінацца пад нагамі і трашчаць. Тады амапаўцы ляглі і папаўзлі да палонкі, прыхапіўшы палку, што трапіла на вочы. Аднак у пажылога чалавека ўжо аслабелі рукі... Адзін з міліцыянераў падпоўз бліжэй і ў нейкі момант здолеў схапіць спачатку адну руку рыбака, а потым і другую. Праз некалькі секундаў міліцыянеры змаглі выцягнуць пацярпелага на лёд і пацягнулі да берага. Там занеслі яго да «УАЗа» і даставілі ў бальніцу. Высветлілася, што 81-гадовы мінчанін выправіўся на рыбалку. Па лёдзе ён перасоўваўся на лыжах, але не разлічыў яго таўшчыню і апынуўся ў вадзе.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Класныя навіны

Google — у дапамогу настаўнікам

Парк высокіх тэхналогій і карпарацыя Google запусцілі бясплатны інтэрнэт-курс для настаўнікаў «Базавыя сэрвісы для адукацыі». Першыя заняткі прайшлі ў вучэбным цэнтры Парка высокіх тэхналогій у Мінску, а таксама на базе IT-акадэміі у Лідзе і Наваполацку.

У ходзе інтэрнэт-курса эксперты падзеляцца са слухачамі новымі ўменнямі і навыкамі, а слухачы, у сваю чаргу, змогуць абмяняцца вопытам з калегамі з усяго свету. У педагогаў будзе магчымасць даведацца, як іншыя настаўнікі арганізуюць праверку хатніх работ дзякуючы Google Drive, выкарыстоўваюць Google-карты, кантактуюць з вучнямі і іх бацькамі праз платформы Google, разам з класам абмяркоўваюць творы мастацтва, прадстаўленыя ў Акадэміі культуры Google, і г.д. Мэта курса — паказаць, як з дапамогай інтэрнэт-сэрвісаў можна індывідуалізаваць працэс навучання, абудзіць у вучняў інтарэс да ведаў і спрасціць задачы па правядзенні ўрокаў.

Каб запісацца на курс, трэба наведаць сайт http://g.co/basicsforteaching і зарэгістравацца там у якасці слухача. Слухачы, якія паспяхова выканаюць выніковы праект, змогуць атрымаць сертыфікат аб праходжанні курса.

Надзея НІКАЛАЕВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район» проводит аукцион по продаже следующего имущества:

№ лота	Наименование объекта	Год выпуска	Адрес объекта	Начальная стоимость объекта, бел. руб. с НДС	Размер задатка, бел. руб.
1.	Прицеп KRONE ADP 24, рама № MW1036497, б/у	1991 г.в.	д. Курганы, Минский р-н	30 972 000	3 097 200

Условия проведения аукциона:

Организатором аукциона и продавцом является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район», адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, комната 302.

Торги состоятся 17.12.2014 года в 10.00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административный блок ГВП, 2-й этаж, к. 208.

Шаг аукциона – **5%** начальной стоимости объекта.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности.

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесения задатка в белорусских рублях;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район» № 3012204960010 в ф-ле Минская городская дирекция ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, код 153001963, УНН 600438617.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона заключает договор купли-продажи в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. В случае уклонения или отказа от заключения договора задаток победителю аукциона не возвращается.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе объектов осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 10 банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **16.12.2014 года 14.00** включительно по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 3-й этаж, комната 303.

Тел.: (017)237-91-32, (029)261-02-84. УНП 600438617

ОАО «Амкодор-Белвар»

220005, г. Минск, проспект Независимости, 58

Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 19 декабря 2014 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 58, зал заседаний Общества (корпус № 30, 3 этаж).

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.55. Орган, созывающий собрание: Совет директоров. Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от 5 декабря 2014 года. Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – 12 декабря 2014 года.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О реорганизации ОАО «Амкодор-Белвар» путем присоединения к нему ООО «БЕЛ-ФЕР»».
2. О заключении договора о присоединении и наделении полномочиями на подписание договора о присоединении.
3. Об утверждении договора о присоединении.
4. Об утверждении передаточного акта.
5. О внесении изменений в Устав ОАО «Амкодор-Белвар».
6. О выпуске акций.
7. О выкупе акций в связи с реорганизацией ОАО «Амкодор-Белвар» по требованию его акционеров.
8. Об избрании членов Совета директоров.

С информацией (материалами), подлежащей представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 15 декабря 2014 года в бухгалтерии Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность или договор).

УНП 100363840 **Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар»**

УНП 290671335

ДОПОЛНЕНИЕ К ГОДОВОМУ ОТЧЕТУ ОАО «Гранд Фэшен Хаус» за 2013 год,

опубликованному в газете «Звязда» 26 марта 2014 года, по состоянию на 01 января 2014 года

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

Наименование показателей	Единицы измерения	за 2013 год	за 2012 год
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	50 647	0

Количество акционеров: **всего – 42, в том числе, юридических лиц – 7, из них нерезидентов РБ – 3, физических лиц – 35, из них нерезидентов РБ – 3.**

Правила корпоративного поведения применяются, Регламент работы ОАО «Гранд Фэшен Хаус» с реестром владельцев ценных бумаг утвержден очередным общим собранием акционеров 04.03.2010 г., ведется учет аффилированных лиц Общества в соответствии с Положением об учете аффилированных лиц, утвержденным решением совета директоров от 25.06.2009 г.

ФАВАРЫТ АЛФЁРАЎСКАГА ФОНДУ

Алфёраўскі фонд і Нацыянальная акадэмія навук назвалі пераможцу конкурсу сярод маладых навукоўцаў. Прэмія прысуджана Аляксею Труханаву, кандыдату фізіка-матэматычных навук, вядучаму навуковаму супрацоўніку Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па матэрыялазнаўстве.

Малады навуковец атрымаў пры тайным галасаванні камісіі абсалютную большасць галасоў за работу «Шматслойныя плёначныя, нанапамерныя і кампазіцыйныя матэрыялы для экраніравання прылад мікраэлектроннай тэхнікі ад магнітных і электрамагнітных палёў натуральнага і штучнага паходжання».

Вядомымі вучонымі Беларусі для ўдзелу ў конкурсе былі вылучаны шэсць кандыдатур маладых навукоўцаў, работы якіх атрымалі прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Па загадзя дасягнутых дамоўленасцях, інфармацыя аб вылучэнні кандыдатаў не рабілася здабыткам грамадскасці. Намінатары (а гэта вядучыя вучоныя краіны ў пэўнай вобласці) не ставілі ў вядомасць намінантаў аб іх вылучэнні на суісканне прэміі. Прычым гэтая канфідэнцыяльнасць захоўвалася на ўсіх этапах конкурсу аж да прыняцця рашэння. Члены камісіі па прэміях заслухалі даклады намінатараў аб дасягненнях маладых навукоўцаў, абмеркавалі змест іх работ, публікацыйную, дзелавую і грамадскую актыўнасць. У бюлетэні для тайнага галасавання былі ўключаны ўсе шэсць вылучаных кандыдатур.

Прэмія Алфёраўскага фонду і Нацыянальнай акадэміі навук за навуковыя работы і вынаходкі, якія маюць важнае значэнне для фундаментальнай і прыкладной навукі, была заснавана ў чэрвені бягучага года ў мэтах заахвочвання маладых навукоўцаў. Ініцыятыва належыць нобелеўскаму лаўрэату, віцэ-прэзідэнту Расійскай акадэміі навук, замежнаму члену НАН Беларусі, акадэміку Расійскай акадэміі навук Жарэсу Алфёраву. Прэмія будзе ўручацца штогод напярэдадні гадавіны стварэння Нацыянальнай акадэміі навук па выніках конкурсу. Пераможца атрымлівае суму ў беларускіх рублях, эквівалентную 2,5 тысячы долараў.

Намінацыя, па якой абвяшчаецца конкурс, вызначаецца штогод рашэннем Бюро Прэзідыуму НАН Беларусі па ўзгадненні з акадэмікам Жарэсам Алфёравым. Сёлета пераможца вызначаўся ў намінацыі «Нана- і мікраструктуры: тэхналогіі атрымання, дыягностыка і новыя прымяненні». Для найбольш поўнага ахопу ўсіх напрамкаў даследаванняў прадугледжана ратацыя намінацыі ў рамках трохгадовага цыкла. Налета пераможцы будуць вызначацца па наступных напрамках: фізіка, матэматыка, інфарматыка і фізіка-тэхнічныя навукі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

МІНУС 40 СЁЛЕТА НЕ ПЛАНУЕЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дзмітрый Рабаў упэўнены, што і ў студзені тэмпература таксама будзе трымацца ў межах кліматычнай нормы. Падобнай можна назваць сітуацыю і з лютым, аднак існуе адно адрозненне: у паўднёвых раёнах сярэдняя месячная тэмпература паветра чакаецца недзе на 0,1–0,5 градуса ніжэйшай за кліматычную норму.

Не раіць спадар Рабаў верыць усім сінаптычным прагнозам на зіму, якія прапануюцца спажыўцам у пачатку восені так званымі «прафесарамі ад інтэрнэту». Насамрэч казаць пра ўсталяванне анамальна нізкіх тэмператур у зімовы перыяд 2014–2015 гадоў не прыходзіцца. Штогод тэмпература паветра апускаецца да мінус 20–30 градусаў, асабліва гэта характэрна для студзеня. Такія тэмпературы магчымыя і сёлета, лічыць Дзмітрый Рабаў. А вось гаварыць, наколькі снежнай будзе наша зіма, увогуле нельга. Бо для таго, каб выпала вельмі

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

шмат снегу, дастаткова ўсяго аднаго сур'ёзнага цыклону.

На поўначы падмарозіць, а ў Мінску — пад нагамі каша

Ужо традыцыйна начальнік службы паспрабаваў зрабіць папярэдні прагноз на галоўнае свята года. Такім чынам, у навагоднюю ноч тэмпература паветра па краіне з верагоднасцю ў 70% складзе ад мінус 4–5 градусаў па паўночным усходзе да плюс 1–2 градусаў па захадзе краіны. У Мінску ў гэтую ноч чакаецца мінус 1–3 градусы, а ўдзень — каля 0. У цэлым на тэрыторыі Беларусі прагназуюцца невялікія ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу, удакладніў спецыяліст. Не зусім зразумела пакуль і са снегам на святы. Усё будзе залежаць ад таго, колькі яго выпадзе напярэдадні. Разам з тым у сталіцы якаснага снегу ў першыя дні студзеня мы яўна не ўбачым. Пры нулявой тэмпературы любы снег у межах вялікага горада ператвараецца ў шэрую кашу.

Чакаем рэкордаў з «плюсам»?

Нагадаем, што ў Беларусі самай халоднай, па выніках метэаралагічных назіранняў, лічыцца зіма 1939–1940 гадоў, калі на метэастанцыі Талачын тэмпература паветра склала мінус 42,2 градуса. Аднак паўтарэння падобных маразоў у гэтым зімовым сезоне нашы спецыялісты не чакаюць. Гэта тлумачыцца тым, што ўжо больш за 20 гадоў на планеце назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя глабальнага пацяплення.

Адзначым некалькі фактаў і па снежні. Абсалютны мінімум тэмпературы паветра (мінус 38,6 градуса) быў зафіксаваны на метыястанцыі Езярышча менавіта 31 снежня 1978 года. А цяпляй за ўсё ў першы месяц зімы было ў Брэсце 5 снежня 1961 года. Пры тэмпературы паветра плюс 14,5 градуса тады на захадзе Беларусі стаяла амаль вясна.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Са святам!

ЗАЎСЁДЫ МАЛАДАЯ «АЛЕСЯ»

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшоў «круглы стол» на тэму «Жанчыны Беларусі: Асобы, падзеі, часопіс», прысвечаны святкаванню 90-годдзя часопіса «Алеся».

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Міністр інфармацыі Лілія Ананіч віншуе з юбілеем часопіса намесніка дырэктара РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» — галоўнага рэдактара «Алесі» Ларысу Ракоўскую.

Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ зачытала віншаванне калектыву «Алесі» ад кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі.

— Старонкі «Алесі» паказваюць развіццё не толькі жаночага руху, яны паказваюць, як развівалася наша краіна, — сказала Лілія Станіславаўна. — Жанчына — гэта душа сям'і, народа і нацыі, яна фарміруе духоўны код грамадства. Пагартаўшы старонкі гэтага выдання, мы можам убачыць, якімі былі нашы бабулі і што любілі нашы мамы. Часопіс дае самую шырокую палітру жыцця беларускай дзяржавы. Хацелася б, каб ён, нягледзячы на свой узрост, заўсёды заставаўся маладым і юным, таму што жанчыны таксама заўсёды застаюцца маладымі. Сёння яны займаюць важныя пасады ў грамадскіх, дзяржаўных структурах, на прадпрыемствах, у арганізацыях і пры гэтым выхоўваюць дзяцей, з'яўляюцца добрымі гаспадынямі і жонкамі. Берагчы духоўна-маральныя каштоўнасці ў нашай краіне — у гэтым асноўная задача жаночага часопіса.

— Сёння мала якія часопісы і газеты маюць такую багатую гісторыю, — далучылася да віншаванняў **сустаршыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» Антаніна МОРАВА.** — Мяняліся назвы часопіса, рубрыкі, мяняліся рэдактары і эпохі, але заставалася заўсёды адно — змест. Задачы, якія былі пастаўлены перад выданнем 90 гадоў таму, актуальныя і сёння. Гэта праблемы жанчын, сям'і і выхавання дзяцей. Часопіс расказвае пра лёсы жанчын, дапамагае парадамі, адукоўвае — дзеліцца радасцю.

Гутарка за круглым сталом атрымалася цікавая. І гэта не дзіўна, бо ў ёй удзельнічалі людзі, якія мелі самае непасрэднае дачыненне да выпуску часопіса і да яго праблематыкі. На мерапрыемстве прысутнічалі жанчыны, якія ўзначальвалі «Алесю» ў розныя гады: Марыя Карпенка, Раіса Баравікова, Тамара Бунта, а таксама старшыня цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў культуры Наталля Аўдзеева, генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Ірына Саксонава, намеснік старшыні Саюза жанчын, старшыня аддзялення «Сялянка» Рэгіна Давідовіч. Вёў «круглы стол» намеснік дырэктара РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Алесь Бадак.

Сёння «Алеся» — адно з найстарэйшых выданняў Беларусі, адзіны ў краіне дзяржаўны часопіс для жанчын. Першы нумар «Беларускай работніцы і сялянкі» (так тады называлася выданне) убачыў свет у канцы лістапада 1924 года. На працягу ўсёй гісторыі рэдактарамі часопіса былі выключна жанчыны.

З першага кастрычніка 2014 года часопіс «Алеся» выдаецца «Выдавецкім домам «Звязда». Заснавальнікамі часопіса з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі Беларусі і грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын».

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ

■ Індустрыя гасціннасці

КАБ ПРЫМАЦЬ І РАДАВАЦЬ ЛЮДЗЕЙ

У 1959 годзе многія рэчы, такія як, напрыклад, тэлевізар у дамах простых савецкіх грамадзян, былі вялікай рэдкасцю і раскошай. А ў новаўзведзенай гасцініцы «Мінск», якая афіцыйна адкрылася 15 студзеня і была першай у рэспубліцы гасцініцай павышанай камфортнасці, тэлевізар быў не толькі на кожным паверсе, але і ў кожным нумары!

ВІЗІТНАЯ КАРТКА РЭСПУБЛІКІ

Значнасць падзеі адкрыцця падобнай установы складана пераацаніць. Новы атэль быў узведзены па праекце архітэктара Генадзя Баданава ў стылі «рацыяналізм» на галоўнай магістралі сталіцы (тады яна мела назву праспект імя Сталіна) на месцы колішняй гасцініцы «Нова-Берлін». Ён павінен быў стаць не толькі візітоўкай Мінска, што адлюстравалася ў яго назве, але і ўсёй БССР. На шасці паверхах гасцініцы размясціліся 265 камфартабельных нумароў на 447 месцаў. Пра ўзровень новай установы сведчыла і тое, што, апроч тэлевізараў, у кожным нумары быў прадугледжаны поўны санвузел і тэлефон. А яшчэ тут было ўласнае паштовае аддзяленне, тэлефонная станцыя з выхадам у міжгароднія і міжнародныя сеткі, ашчадная каса і камбінат бытавога абслугоўвання. Таксама на тэрыторыі гасцініцы працавалі буфет, кругласутачны буфет-бар, а на першым паверсе знаходзіўся рэстаран «Мінск», які карыстаўся вялікай папулярнасцю ў мінчан і гасцей.

Адметна, што самы першы здымак новага атэля быў апублікаваны 30 снежня 1958 года ў газеце «Звязда», а ўжо ў 1959 годзе (тады святкавалі 40-ю гадавіну ўтварэння БССР) гасцініца прыняла сваіх першых пастаяльцаў.

Гасцініца «Мінск» займела такую папулярнасць, што неўзабаве з'явілася неабходнасць пашырыць плошчы для пражывання гасцей, і ўжо праз 10 гадоў, у 1969-м, быў узведзены другі яе сяміпавярховы корпус па праекце архітэктараў Георгія Сысоева і Сяргея Мусінскага са 105 нумарамі на 324 месцы. Кожны нумар быў абсталяваны па аналагу з апартаментамі першага корпуса, а на апошнім паверсе размясціўся рэстаран «Сёмае неба», які пасля стаў легендарным. Такім чынам, на цяпер ужо Ленінскім праспекце з'явіўся цэлы гасцінічны комплекс.

Вядома, немалая адказнасць лягла на долю персаналу гасцініцы, бо яму даводзілася прымаць не толькі суайчыннікаў, але і замежных гасцей. А сярод пастаяльцаў галоўнага атэля краіны былі і дзеячы партыі і ўрада, навукі, культуры, мастацтва, міжнародныя дэлегацыі. Ці варта казаць, наколькі сур'ёзным выпрабаваннем на прафесійную кампетэнтнасць і майстэрства для персаналу гасцінічнага комплексу стала Алімпіяда-80?.. Тады Мінск, у ліку іншых савецкіх гарадоў, прымаў удзельнікаў алімпійскіх футбольных баталій. Увесь свет тады пільна сачыў не толькі за ходам спартыўных спаборніцтваў у краіне за «жалезнай заслонай». Не меншая ўвага надавалася тым умовам, у якіх былі арганізаваны побыт і вольны час зорак сусветнага спорту. Але гасцінічны комплекс з гонарам вытрымаў гэты іспыт, пакінуўшы ў памяці алімпійцаў толькі добрыя ўспаміны, а на старонках кнігі ганаровых гасцей — падзячныя водгукі.

ПЕРШАЯ ЧАТЫРОХЗОРНАЯ

Новая старонка гісторыі сталічнай гасцініцы «Мінск» пачалася ў 1995 годзе, калі комплекс увайшоў у структуру Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. Час патрабаваў вываду індустрыі гасціннасці на прынцыпова новы, сучасны міжнародны ўзровень. Таму адным з пытанняў, якія паўсталі перад адміністрацыяй комплексу, стала рэканструкцыя гасцініцы, якая і была праведзена ў 2001—2002 гадах. У выніку ў беларускай сталіцы з'явіўся першы ў краіне сучасны атэль катэгорыі «4 зоркі» (пра «5-зоркавыя атэлі ў сталіцы ў той час яшчэ гаворкі не было). Разам з тым, папоўнілася скарбонка нашай культурнай спадчыны: у жніўні 2001 года гасцінічны комплекс «Мінск» быў унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Сучасны атэль мае 265 камфартабельных нумароў, уключаючы два апартаменты і прэзідэнцкі нумар. Да паслуг гасцей — рэстаран «Мінск» і ўтульны лобі-бар, банкетная зала, рэстаран і бар «Сёмае неба». Для дзелавых людзей у гасцініцы абсталяваны канферэнц-зала, бізнес-хол і пакой перамоў; ёсць бізнес-цэнтр, а таксама аўтастаянка, якая ахоўваецца кругласутачна. Для амататараў адпачынку на тэрыторыі атэля размясціліся фітнес-клуб, салон прыгажосці, казіно і начны клуб, пункт абмену валют. Усе нумары атэля абсталяваны электроннымі замкамі, кандыцыянерамі, дэтэктарамі дыму. У кожным нумары ёсць тэлефон з выхадам на міжнародную лінію, тэлевізар, міні-бар і міні-сейф. Апроч таго, пастаяльцы могуць бясплатна выходзіць у інтэрнэт праз Wi-Fi.

Не сакрэт, што цяпер гасцінічны бізнес не толькі ў Беларусі, але і па ўсім свеце існуе ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі. Як грыбы пасля дажджу, у горадзе «растуць» усё новыя атэлі, з'явілася ўжо некалькі гасцініц катэгорыі «5 зорак». Аднак «Мінск» не здае пазіцый, у многім дзякуючы таму, што яе супрацоўнікі шмат робяць, каб

Апроч тэлевізараў, у кожным нумары быў прадугледжаны санвузел і тэлефон. А яшчэ тут было ўласнае паштовае аддзяленне, тэлефонная станцыя з выхадам у міжгароднія і міжнародныя сеткі, ашчадная каса і камбінат бытавога абслугоўвання.

Тое самае першае фота гасцініцы, размешчанае ў «Звяздзе».

Так выглядалі першыя нумары.

інстытута кансьержаў. На гэтую адказную пасаду прызначаюцца камунікабельныя, добразычлівыя і таварыскія людзі з веданнем замежных моў. У абавязкі ўваходзіць аказанне ўсебаковай інфармацыйнай дапамогі гасцям атэля.

ГІСТОРЫЯ ПРА ПАПЯЛУШКУ

Якіх толькі гасцей з усяго свету, у тым ліку ганаровых, не даводзілася прымаць супрацоўнікам атэля за час яго існавання! За крыху больш чым дзесяцігоддзе ў новым статусе пад «мінскім» дахам спыняліся ўрадавыя дэлегацыі і місіі, грамадскія і палітычныя дзеячы, дзеячы навукі, мастацтва, культуры і іншых абласцей, зоркі сусветнай эстрады і спорту. Калі пагартаць кнігу ганаровых пастаяльцаў, можна знайсці там імёны любімцаў беларускай публікі, бадай, усіх узростаў, жанраў, стыляў і кірункаў...

Сапраўдным выпрабаваннем (але адначасова і гонарам) для персаналу атэля стаў прыём пачэсных VIP-гасцей у гонар 60-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: першай жанчыны-касманаўта, генерал-маёра авіяцыі, Героя Савецкага Саюза Валянціны Церашковай, двойчы Героя Савецкага Саюза, лётчыка-касманаўта, генерал-палкоўніка авіяцыі Пятра Клімука, легендарнага паветранага аса Вялікай Айчыннай вайны і вайны ў Карэі, Героя Савецкага Саюза, генерал-маёра авіяцыі Сяргея Крамарэнкі, двойчы Героя Савецкага Саюза, генерал-палкоўніка авіяцыі Уладзіміра Кавалёнка і іншых.

Падчас гасцявання ў атэлі наследны прынц Дубая Саід-аль Мактум сустрэў тут адну з супрацоўніц гасцініцы. Высокі госць зразумеў, што адшукаў сваё шчасце і, доўга не думаючы, прапанаваў дзяўчыне сваю руку і сэрца.

А яшчэ дзякуючы візіту высокіх замежных гасцей атэль займеў нават сваю сапраўдную казачную гісторыю. Падчас гасцявання ў атэлі наследны прынц Дубая Саід-аль Мактум сустрэў тут адну з супрацоўніц гасцініцы, 19-гадовую Наташу Аліеву. Высокі госць зразумеў, што адшукаў сваё шчасце і, доўга не думаючы, прапанаваў дзяўчыне сваю руку і сэрца. Цяпер шчаслівыя наследны прынц і прынцэса Дубая (Наташа Аліева стала прынцэсай Дубая Аішэйз) з сынам час ад часу прыязджаюць у Беларусь і наведваюць атэль як месца, дзе звёў іх лёс. І як тут не паверыць у казку і ў тое, што Папялушка можа ператварыцца ў прынцэсу?..

САКРЭТЫ ПОСПЕХУ

Пэўна, не выпадае спрачацца пра тое, што найбольш важным крытэрыем поспеху і эфектыўнай работы прадпрыемства з'яўляецца аб'яднанне калектыву ў каманду аднадумцаў. У атэлі гэтаму надаецца вялікая ўвага: персанал гасцініцы — сапраўды як адна вялікая сям'я. Тут маральна і матэрыяльна падтрымліваюць сваіх супрацоўнікаў не толькі падчас работы, але і пасля таго, як яны выходзяць на пенсію. Не забываюць ганаровых работнікаў і ветэранаў вайны, якія аддалі працы ў гасцініцы не адзін дзясятак гадоў. Тут памятаюць пра ўсіх кіраўнікоў гасцініцы (а гэта тузін да сённяшняга дня), пачынаючы з атэля даводзілася вучыцца прамудрасцям майстэрства, можна сказаць, на хаду, пераймаючы, аналізуючы і перапрацоўваючы вопыт лідараў гасцінічнага бізнесу. Бадай, дзякуючы гэтаму «Мінск», застаючыся адным з самых старых атэляў з багатай гісторыяй, працягвае падтрымліваць імідж аднаго з самых фешэнебельных у сталіцы. Са сцен атэля выйшлі сапраўдныя спецыялісты індустрыі гасціннасці, якія сталі топ-менеджарамі вядучых атэляў горада і краіны.

Цяпер, калі ВНУ краіны ўжо арганізавалі і праводзяць прафесійную падрыхтоўку спецыялістаў індустрыі гасціннасці, кіраўніцтва атэля працягвае ажыццяўляць сур'ёзную селекцыю выпускнікоў. Кадры адбіраюць як сярод студэнтаў выпускных курсаў, якія праходзяць прафесійную стажыроўку ў атэлі, так і сярод выпускнікоў ВНУ, якія праходзілі практыку ў іншых гасцініцах. Дырэктар Мікалай Жураўскі пастаянна прысутнічае ў якасці эксперта на выпускных іспытах будучых

самых першых — Міхаіла Фёдаравіча Дзячко і Аляксея Аляксандравіча Мачалава, якія былі дырэктарамі ў 1959 годзе. І хоць цяпер яны, на жаль, пакінулі ўжо гэты свет, адміністрацыя атэля не губляе сувязі з іх дзецьмі і ўнукамі. Цёпла адзываюцца супрацоўнікі і аб цяперашнім дырэктару атэля «Мінск» Мікалаю Раманавічу Жураўскім, які кіруе прадпрыемствам з 1998 года і з'яўляецца першым дырэктарам менавіта першага сучаснага атэля ў горадзе і краіне.

Увогуле дзякуючы прадуманаму кіраўніцтву і кадравай палітыцы, а таксама комплексу мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і навучанні персаналу сталі магчымыя ўсе дасягненні атэля ў індустрыі гасціннасці і якасці абслугоўвання. Канешне, казаць, што поспех на прадпрыемства прыходзіў лёгка і адразу, нельга. «Першаадкрывальнікам» атэльераў. За вялікі ўнёсак у развіццё нацыянальнай індустрыі гасціннасці Мікалай Раманавіч двойчы атрымліваў высокія ўзнагароды асабіста з рук Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі.

Якія патрабаванні прад'яўляе атэль для сваіх будучых супрацоўнікаў? Галоўным крытэрыем адбору з'яўляецца, безумоўна, прафесійная падрыхтоўка, абавязковыя якасці — камунікабельнасць, ініцыятыўнасць і жаданне працаваць. Работа ў гасцініцы часам можа быць непрадказальнай, і, на жаль, стрэсавых сітуацый тут не пазбегнуць. Таму важным элементам пры адборы кандыдата з'яўляецца і яго псіхалагічная ўстойлівасць, якая дазволіла б прымаць правільныя рашэнні ў неардынарных і няштатных сітуацыях. Безумоўна, вітаецца веданне некалькіх замежных моў. Акрамя гэтага, для дзеючых супрацоўнікаў атэля рэгулярна праводзяцца атэстацыі і пераатэстацыі з прысваеннем або пацвярджэннем прафесійных катэгорый.

Цяпер на базе атэля «Мінск» арганізавана ўласная падрыхтоўка прафесійных кадраў. Пэўна, найбольш яскрава пра іх дасведчанасць можа сказаць адзін факт. Менавіта гэтаму калектыву было даверана будаўніцтва і станаўленне на ўласныя «рэйкі» будучага флагмана гасцінічнага бізнесу краіны — гасцініцы «Прэзідэнт-атэль».

◆ ◆ ◆

Напярэдадні юбілею хочацца пажадаць атэлю «Мінск» годна прайсці яшчэ не адно 55-годдзе. Каб ніколі не страціці сваёй актуальнасці радкі з гімна гасцініцы (бадай, для нашай краіны гэта ўнікальны выпадак і сведчанне сапраўднай з'яднанасці калектыву — калі атэль мае нават свой карпаратыўны гімн): «Мы вместе с городом своим гордимся именем одним».

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фота Наталлі АСМОЛЫ і з архіва атэля «Мінск»

■ Светлы ўспамін

«НАШ ПРАФЕСАР»

Так яго дагэтуль называюць бацькі хворых дзяцей і ўрачы — яго вучні. У гэтых словах — шмат любові і ўдзячнасці

Год таму не стала ўрача, пра якога ў нашай краіне хадзілі легенды. У бацькоўскім асяроддзі яго называлі Айбаліт , бо ён прымаў дзяцей практычна з любой неўралагічнай паталогіяй. Акадэмік, доктар медыцынскіх навук, прафесар Георгій Шанько, стваральнік дзіцячай неўралагічнай службы ў Беларусі — адной з лепшых у свеце.

Мне пашанцавала пазнаёміцца з гэтым чалавекам. Аднойчы спатрэбіўся яго каментарый для газеты. Нягледзячы на стомленасць пасля заканчэння ўрачэбнага прыёму і загружанасць, ён не толькі цёпла мяне сустрэў, адказаў на ўсе пытанні, падарыў кнігу па дзіцячай неўралогіі, але і наладзіў майстар-клас па заварванні чаю (прычым зрабіў гэта з вялікай любоўю), а таксама прачытаў уласныя вершы, прысвечаныя жонцы. Пасля гэтай сустрэчы мяне не пакідала адчуванне, што на аднаго сябра ў маім жыцці стала больш. Але 9 снежня 2013 года сэрца гэтага незвычайнага чалавека спынілася. Дагэтуль у гэта цяжка паверыць яго сваякам, калегам, вучням, бацькам яго пацыентаў, якіх ён літаральна вёў па жыцці, усім, хто яго ведаў... Не выпадкова, напэўна, яны расшукалі менавіта мяне, якая бачыла яго на працягу ўсяго 40 хвілін, але душэўнага цяпла атрымала на гады, і папрасілі згадаць імя доктара Георгія Шанько на старонках нашай газеты.

Ларыса БАГДАНОВІЧ, педыятр, неўролаг, урач вышэйшай катэгорыі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

— Першае, што ў ім здзіўляла, — тое, як ён размаўляў з дзецьмі. Чалавек вельмі сур'ёзны, але калі ён звяртаўся да маленькага пацыента, то сам пераўтвараўся ў дзіця. У вачах яго загараўся агеньчык, а інтанацыі рабіліся разважлівымі. Любое дзіця пераставала плакаць і спакойна дазваляла яму сябе агледзець. Для неўролага, каб правільна дыягнаставаць захворванне, вельмі важна, каб дзіця было спакойнае.

Курсантам Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі ён заўсёды казаў: «Навучыцеся любіць дзяцей». Яшчэ ён нагадваў, што дзіця — гэта не дарослы ў мініяцюры. Яно развіваецца па ўласных законах, таму нельга ацэньваць стан дзіцяці, пераносячы на яго стан дарослага.

Навучанне ў Георгія Георгіевіча заўсёды адрознівалася добразычлівасцю і адначасова строгасцю. Ён узначальваў кафедру дзіцячай неўралогіі БелМАПА 31 год, з 1980-га. У Савецкім Саюзе існавалі толькі 4 такія кафедры: у Маскве, Казані, Ташкенце і Мінску. І кожная сфарміравала сваю ўласную школу. На сусветным узроўні мінская школа дзіцячай неўралогіі лічыцца адной з самых сучасных і эфектыўных. Георгія Георгіевіча ведалі за мяжой і адносіліся да яго з вялікай пашанай.

Беларусь абавязана гэтаму чалавеку стварэннем службы дзіцячай неўралогіі, якой па паўнаце і наладжанасці няма роўных на ўсёй прасторы былога Саюза. Ён пакінуў шмат вучняў: дзіцячыя неўролагі, педыятры і неанатолагі, якія навучаліся на кафедры дзіцячай неўралогіі, у нас ёсць у кожным раёне. Мы рэгулярна сустракаліся для абмену вопытам і абмеркавання рэдкіх захворванняў.

Акрамя таго, Георгій Георгіевіч быў прызнаны вядучым эпілептолагам у сусветным маштабе. Яго захоплівала і рэабіліталогія. Рознабаковасць і актыўнасць прафесара заўсёды збіралі вакол яго людзей. Яму быў уласцівы філасофскі погляд на хваробу. Ён увесь час прымушаў сумнявацца, разважаць, вучыў глядзець на вывучэнне арганізма чалавека з розных пазіцый. Ці лічыць цэрабральны параліч паталогіяй? А можа, гэта — асаблівасць? Як чалавек веруючы, ён лічыў, што цяжкая хвароба дзіцяці — гэта выпрабаванне для сям'і. Бо вельмі важна быць адказным адзін за аднаго.

Думаю, што змяненне стаўлення грамадскасці да інвалідаў у нашай краіне пачалося з Георгія Георгіевіча Шанько. Бо гэта пачалося з урачоў, дзіцячых неўролагаў. У нашы дні ніхто не сумняваецца, што кожнае дзіця, якім бы цяжкім ні быў яго дыягназ, мае права на актыўную, пастаянную і комплексную рэабілітацыю, якая, калі яна распачата з першых дзён жыцця, дазволіць дзіцяці ўстаць на ногі, хадзіць і адчуваць сябе нармальным чалавекам. Такое меркаванне стала нормай у вялікай ступені дзякуючы падыходу былога кіраўніка кафедры дзіцячай неўралогіі БелМАПА.

Так атрымалася, што шмат людзей у Беларусі праз сваіх дзяцей сталі сябрамі сем'і Георгія Георгіевіча. У яго сям'і ўсе неўролагі: жонка, дзеці, нявестка... На яго пахаванне прыехалі тыя, каго ён лячыў у дзяцінстве, каго вёў усё жыццё. Ужо дарослыя, яны прыехалі з ўласнымі сем'мі і гаравалі, бо яго сыход стаў для іх асабістай стратай.

Адна яго фраза паўплывала на мой светапогляд як рэабілітолага. Першы час мне заўсёды хацелася знайсці прычыну: чаму атрымліваецца так, што дзіця застаецца інвалідам? Але аднойчы Георгій Георгіевіч сказаў: «Ты атрымліваеш дзіця, і не важна — у якім узросце, але ты яго атрымала, ты з ім працуеш, і цябе не павінна хваляваць, што з дзіцем здарылася да гэтага. Бо тое, што здарылася, ніякім чынам не паўплывае на вынік тваёй працы». І гэта сапраўды так. Няма сэнсу шукаць прычыну, траціць на гэта час і энергію, «заводзіць» маці і сям'ю, але трэба сканцэнтравацца на тым, што ёсць на гэты момант, і на тым, што можна будзе атрымаць у будучым. Самае галоўнае ў дзіцячай рэабіліталогіі — фарміраванне ў дзіцяці функцый, якіх яно дагэтуль не мела.

Ён заўсёды ганарыўся вынікамі сваіх вучняў. Галоўныя дзіцячыя неўролагі ў рэгіёнах былі яго сябрамі, паколькі ён лічыў, што толькі ў сяброўскіх адносінах можна разам вырашаць складаныя і маштабныя праблемы, рухацца наперад.

Георгій Георгіевіч стварыў сотні дапаможнікаў і даведнікаў для неўролагаў. Пад яго кіраўніцтвам была напісана першая ў свеце энцыклапедыя дзіцячага неўролага, якая вельмі дапамагае працаваць урачам.

Беларусь абавязана гэтаму чалавеку стварэннем службы дзіцячай неўралогіі, якой па паўнаце і наладжанасці няма роўных на ўсёй прасторы былога Саюза.

Прафесар шмат увагі надаваў хворым. На кафедры штодня адбываўся прыём дзяцей з усёй краіны. Гэта традыцыя захавалася дагэтуль. Акрамя таго, кафедра пастаянна кансультавала і кансультуе Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця», рэанімацыйныя, неўралагічныя аддзяленні, аддзяленні выходжвання нованароджаных па ўсёй Беларусі.

Алена ІВАШЫНА, дацэнт кафедры дзіцячай неўралогіі БелМАПА, кандыдыат медыцынскіх навук, урач вышэйшай катэгорыі:

— Мне пашчасціла 40 гадоў вучыцца дасканаласці прафесіі ў Георгія Георгіевіча Шанько — таленавітага педагога і вучонага, чалавека выключнай працаздольнасці і мудрасці. Ён запальваў у нас, сваіх вучнях, прагу да ведаў, імкненне ўвесь час самаўдасканальвацца. У ім спалучаліся высокі прафесіяналізм, талент арганізатара, вучонага, урача і паэта.

З асаблівым трапятаннем згадваюцца яго міласэрнасць, дабрыня і добразычлівасць да сваіх маленькіх пацыентаў, якім ён вяртаў здароўе, а часам — і жыццё.

Гэты выдатны чалавек назаўсёды застанецца для нас прыкладам выключнай вернасці свайму пакліканню быць Урачом, Настаўнікам і Вучоным.

Зінаіда ЧУЙКО, дацэнт кафедры агульнай урачэбнай практыкі БелМАПА, кандыдат медыцынскіх навук:

— Яго незвычайны асабісты магнетызм, згустак жыццёвай энергіі і доля здаровага аптымізму надзвычай прыцягвалі навакольных. Ён валодаў пачуццём гумару, шырокай эрудыцыяй і заўсёды клапаціўся і пра сваіх вучняў, і пра супрацоўнікаў кафедры. Напэўна, таму яму ўдалося стварыць добрую неўралагічную службу ў Беларусі. Я ганарыся тым, што была яго вучаніцай.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА ■

■ Людзі і лёсы

ЧОРНАЯ З ЗОЛАТАМ

Свае іконы ў традыцыях палехскага жывапісу яны пісалі падпольна

Яна сустрэла мяне на парозе сваёй невялікай мінскай кватэры. Яна такая ж — маленькая, сціплая, прывабная жанчына. Увайшоўшы, патрапіла нібы ў карцінную галерэю. Карціны віселі на сценах, іншыя стаялі ў пакоі — на падлозе, шчыльна прыціснутыя адна да адной...

Гэта кватэра Ражковых. Тых самых мастакоў, якія прыехалі ў Беларусь са знакамітага Палеха. Яны і праславіліся менавіта дзякуючы палехскай іканапіснай школе. Антаніна Мікалаеўна ўжо адна. У 2002 годзе памёр яе знакаміты муж, мастак Вячаслаў Ражкоў. Нядаўна пайшла з жыцця яе адзіная дачка. Пра былое, хутчэй, шчаслівае жыццё, нагадваюць творы, з якімі яна засталася сам-насам.

Майстэрню, у якой стваралі свае шэдэўры Ражковы, папрасілі вызваліць адразу, як памёр Вячаслаў Зіноўевіч. Карціны трэба было кудысьці прыбіраць. А куды? Нягледзячы на просьбы ўдавы, майстэрню ўсё ж такі забралі. А на пытанне, што рабіць з палотнамі, прапанавалі іх проста спаліць на дзіцячай пляцоўцы. Антаніна Мікалаеўна знайшла выйсце. Адны карціны аддала на выставы, якія сама арганізоўвала ў навучальных установах Мінска. Іншыя знайшлі прытулак тут, дома.

Ражковым мала калі шанцавала. Цяжкасці сустракаліся на кожным кроку. Мастакоў з расійскай глыбінкі ў Мінску прымаць не хацелі. Напэўна, баяліся канкурэнцыі? А можа, не разумелі іх мастацтва?

Творчасці Ражковы вучыліся ў самым сэрцы рускага іканапісу — у Палеху. Як кажуць, сам Бог загадаў. Яна тут нарадзілася, ён — каля горада Шуя, што непадалёк. Абое з простых сем'яў, удваіх скончылі Палехскае мастацкае вучылішча імя Горкага. Праўда, у розны час. Давучыцца Вячаславу не дала Вялікая Айчынная вайна. У складзе 19-га танкавага корпуса 101-й танкавай брыгады ваяваў на Курскай дузе, дайшоў да Берліна.

Пасля франтавой загартоўкі вярнуўся ў вучылішча, адразу на чацвёрты курс. Тады і пазнаёміўся з першакурсніцай Антанінай. Іх настаўнікамі былі выбітныя майстры Палеха, былыя іканапісцы дарэвалюцыйных Сафронаўскіх іканапісных майстэрняў. Ажаніліся ў 1948 годзе. Ён працаваў у жанры лакавай мініяцюры ў мастацкіх майстэрнях Палеха. Яна — у мясцовым Доме культуры, яшчэ «агучвала» радыёкропку.

Час быў такі. І ён, член Саюза мастакоў СССР, а яна, член камуністычнай партыі, таямніча пісалі 24 іконы для царквы.

Першы поспех прыйшоў у 1957 годзе, калі на выставе ў Бруселі работа Вячаслава Ражкова «Раніца нашай Радзімы» атрымала залаты медаль. Аднак нічога не змянілася. Грошай так і не плацілі, таму жылі беднавата. Надзея на лепшае жыццё з'явілася тады, калі яго маці, пераехаўшы ў Ленінград, паклікала іх да сябе. Вячаслаў уладкаваўся ў вайсковую часць мастаком. Антаніна працавала ў швейным атэлье — у майстэрні па роспісе тканіны. Ён жыў за горадам, яна — у каморы, якую выдзеліла свякроў.

Аднак усё было б добра, каб з Германіі не вярнуўся брат Вячаслава. Няма дзе было размясціць прывезеную адтуль маёмасць — і маладой Антаніне больш нічога не заставалася, як кінуць працу і вярнуцца да бацькоў у Палех. Як толькі пра гэта даведаўся Вячаслаў, пасварыўшыся з братам-«франтавіком», паехаў па жонку. У Ленінград яны больш не вярнуліся. Бацька Антаніны пачаў будаваць для іх хату. Гэта быў першы дом на вуліцы Мічурынскай, якую пасля паміж сабой сталі называць вуліцай мастакоў. А ўсё таму, што ўслед за імі тут пачалі будавацца і астатнія палехскія творцы. І праца закіпела...

Антаніна РАЖКОВА.

— Дык навошта паехалі ў Беларусь, калі ўсё толькі наладжвалася? — цікаўлюся.

— Нашы таварышы з Палеха, якія ўжо на той час жылі ў Мінску, расказалі, што тут лягчэй жыць, створаны ўсе ўмовы для мастацтва, — успамінае Антаніна Мікалаеўна. — Чакалі там і нас, казалі, што мастакам даюць кватэры. Сапраўды, кватэру атрымалі. Праўда, трохпакаёвую, толькі на тры сям'і. Самі арандавалі падвал на Чырвонай. Свае першыя іконы пісалі падпольна...

Час быў такі. І ён, член Саюза мастакоў СССР, а яна, член камуністычнай партыі, таямніча пісалі 24 іконы для царквы. Усе — унікальныя, выкананыя ў палехскім стылі: распісаныя золатам на чорным фоне, з вялікай разнастайнасцю элементаў кампазіцыі. Частку твораў адразу перадалі для адкрыцця праваслаўнага храма ў Японіі. Астатнія і сёння захоўваюцца ў Кафедральным саборы Сашэсця Святога Духа, галоўным храме беларускага экзархата Рускай Праваслаўнай царквы.

Яны не былі толькі іканапісцамі. У сваіх творах мастакі Ражковы выкарыстоўвалі былінныя, казачныя сюжэты, гістарычныя падзеі, вобразы літаратурнай класікі, прыроды. «Я заўсёды ішла побач з ім, — працягвае яна. — Нарыхтоўвала і дапрацоўвала яго творы. Я не лічыла сябе вялікай мастачкай. Проста была выканаўцам, а ён — творцам».

Тое, што яны працуюць у традыцыі палехскага жывапісу, і выклікала незадаволенасць у некаторых беларускіх калег. Якраз арганізоўваўся Мінскі мастацкі камбінат. Вядома, як і многія мастакі, Ражковы хацелі туды патрапіць. Аднак некаторыя калегі запратэставалі: маўляў, наша творчасць для іх чужая. «У 1967 годзе ў часопісе «Кракадзіл» нават з'явіўся насмешлівы пасквіль, у якім нас выправаджвалі з Беларусі, — расказвае Антаніна Мікалаеўна. — А потым сказалі: «Ражкову мы працу дадзім, але яго жонка няхай на гэта не разлічвае». І я, таксама па адукацыі мастак, пайшла працаваць на фарфоравы завод, займалася адміністрацыйнай работай...»

Яна фактычна стаяла ля вытокаў Мінскага фарфоравага завода. Вучылася роспісу па фарфоры ў Расіі і нават прывезла адтуль больш за дзясятак майстроў. І толькі пасля шматлікіх гадоў працы там яе, як выдатнага арганізатара, узялі на Мінскі мастацкі камбінат загадчыкам афарміцельскага цэха. І толькі тады ў Антаніны Ражковай з'явілася магчымасць займацца любімай справай, рабіць тое, чаго многія не ўмелі. У выніку з'явіўся цэлы шэраг твораў на сюжэты рускіх народных казак. Яны з мужам не толькі пісалі карціны, але і не шкадавалі дзяліцца імі: аддавалі ў дзіцячыя садкі, іншыя ўстановы для ўпрыгажэння інтэр'ера. Калідоры 10-й клінічнай бальніцы і сёння афармлены іх казачнымі акварэлямі.

Ражковы пражылі ў Мінску амаль 40 гадоў. За гэты час арганізавалі 27 выстаў. З іх не прынеслі дахаты ні адной карціны: працы былі або раскуплены, або раздораны. Сёння творы Вячаслава Ражкова захоўваюцца ў Рускім музеі Санкт-Пецярбурга і Траццякоўскай галерэі, у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі і Палехскім мастацкім музеі. І вельмі крыўдна, што сярод калег-мастакоў ніхто не цікавіўся іх мастацтвам, не прасіў навучыць. Акрамя, бадай што, аднаго маладога юнака, якога сёння мы ведаем як іканапісца Паўла Жарава. І дачкі Святланы, якая вучылася творчасці ў Бабруйскім мастацкім вучылішчы.

— Яго прызнавала старэйшае пакаленне, — гаворыць Антаніна Ражкова пра мужа. — Ваенныя, тыя, хто прайшоў такую ж бойню: Каткоў, Савіцкі...

Выстаўленая літаральна на вуліцу пасля яго смерці, яна не толькі змагла захаваць кожную работу, а нават арганізавала пасмертныя выставы! Прадала гараж, некаторыя асабістыя рэчы — і 150 карцін адправіла на выставу ў Санкт-Пецярбург. І сёння жанчына імкнецца зрабіць усё дзеля таго, каб творы, якія захоўваюцца дома, убачыла як мага больш людзей.

— Мне не трэба ніякіх грошай, тым больш, мне не патрэбна прызнанне, — тлумачыць Антаніна Мікалаеўна. — Проста хачу, каб яго працы жылі — у музеі, офісе, дома... Няхай жывуць у людзей!

І гэта не пустыя словы. Бо, як прызнаюцца знаёмыя Антаніны Ражковай, хто б ні прыйшоў да яе, не сыходзіць без падарунка. З карцінай, мініяцюрай, распісной шкатулкай... І як я ні адмаўлялася, на памяць аб гэтай цудоўнай жанчыне, аб творчай і таленавітай сям'і ў мяне засталіся завушніцы, створаныя рукамі гаспадыні ў традыцыі палехскага жывапісу.

Вераніка КАНЮТА.
Фота аўтара ■

Патрабуюцца ініцыятыўныя, крэатыўныя, адказныя

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Актуальным пытанне аб колькасці спецыяльнасцяў І ступені вышэйшай адукацыі стала ў выніку пераходу на дзве ступені падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, калі ўсе спецыяльнасці аднаступенчатай вышэйшай школы былі аўтаматычна аднесены да І ступені вышэйшай адукацыі. Адначасова сталі з'яўляцца і спецыяльнасці магістратуры — зараз у класіфікатар унесена ўжо 319 спецыяльнасцяў магістратуры.

Скачкі адбываліся двойчы: у 2012 годзе — у бок змяншэння (на 7% у сувязі з пераглядам педагагічных спецыяльнасцяў), і ў 2013 годзе — у бок павелічэння (на 8% у сувязі са скарачэннем тэрмінаў навучання на першай ступені). Інтарэс да колькасці спецыяльнасцяў узрос і ў сувязі з тым, што рэйтынг ВНУ напрамую залежыць ад колькасці адкрытых ва ўстанове адукацыі спецыяльнасцяў.

— Разнастайнасць зместу вышэйшай адукацыі, да якой імкнуцца вышэйшыя навучальныя ўстановы, выражаецца ў разнастайнасці найменняў спецыяльнасцяў. Аднак за шматлікімі прыцягальнымі і кідкімі назвамі ў шэрагу выпадкаў складана разгледзець віды эканамічнай дзейнасці, у якія «ўвальюцца» будучыя спецыялісты, — падкрэслівае Вольга Олекс.

Акрамя таго, установы адукацыі даволі часта імкнуцца захоўваць і маральна састарэлыя спецыяльнасці. Па-першае, ёсць патрэба ў кадрах адпаведных кваліфікацый з боку асобных арганізацый, а па-другое, гэта дае магчымасць захаваць вучэбную нагрузку і прафесарска-выкладчыцкі састаў, заняты ў падрыхтоўцы адпаведных спецыялістаў. Таму патрабуецца рэвізія спецыяльнасцяў усіх узроўняў і ступеняў адукацыі, у тым ліку і сярэдняй спецыяльнай. Мэтазгодна перайсці ад прыгожых і мудрагелістых найменняў да кароткіх і ёмістых найменняў спецыяльнасцяў, якія будуць адлюстроўваць віды эканамічнай дзейнасці.

СФАРМУЛЮЙЦЕ ПАТРАБАВАННІ

Трэба прааналізаваць і сістэму кваліфікацый. У шэрагу выпадкаў складана адказаць на пытанне, што скрыта за найменнем кваліфікацыі. Напрыклад, працадаўцу (упраўленню ўнутраных спраў) не зразумела, хто такі «Інжынер-сістэматэхнік» па спецыяльнасці «Сістэмы аўтаматызаванага праектавання», у рамках якой была прысвоена гэтая кваліфікацыя. Зараз аналага такой спецыяльнасці няма, і кваліфікацыя набыла некалькі іншы змест. Ці другі прыклад — кваліфікацыя «Эканаміст». Чым адрозніваюцца аднайменныя кваліфікацыі на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі?

На думку Вольгі Олекс, трэба перагледзець паняцце «Кваліфікацыя», устанавіць наменклатуру кваліфікацый па ўзроўнях і ступенях адукацыі, распрацаваць і зацвердзіць кваліфікацыйныя патрабаванні, якія прад'яўляюцца да кожнай кваліфікацыі, уключаючы патрабаванні да іх прысваення. Больш актыўнай павінна стаць і кадравая палітыка працадаўцаў. Многія наймальнікі прызвычаіліся арыентавацца на запісы ў дыпломах, а не на ацэнку магчымасцяў маладога спецыяліста.

«Больш за тое, многія працадаўцы нават не могуць сфармуляваць свае патрабаванні да спецыялістаў. Для збліжэння магчымасцяў адукацыі з патрэбамі рынку працы патрабуецца незалежная і некамерцыйная арганізацыя, якая б займалася маркетынгавымі даследаваннямі на рынку працы, — падкрэсліла Вольга Олекс. — Ініцыятыва аб яе стварэнні была агучана яшчэ два гады таму...»

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны сумесна з Міністэрствам адукацыі і Акадэміяй кіравання займаюцца зараз удасканаленнем нацыянальнай сістэмы кваліфікацый. Плануецца стварэнне сертыфікацыйных цэнтраў, якія будуць выдаваць сертыфікаты людзям, што здалі пэўны мінімум. Мяркуецца, што не маючы інжынернай адукацыі, чалавек зможа атрымаць сертыфікат інжынера.

Больш актыўнай павінна стаць і кадравая палітыка працадаўцаў. Многія наймальнікі прызвычаіліся арыентавацца на запісы ў дыпломах, а не на ацэнку магчымасцяў маладога спецыяліста.

— Спадзяёмся, што працэс удасканалення нацыянальнай сістэмы кваліфікацый завершыцца павышэннем якасці адукацыі і прафесійнай кампетэнтнасці асоб, занятых у эканоміцы краіны. Пры гэтым будуць распрацаваны і ўведзены ў дзеянне прафесійна-кваліфікацыйныя стандарты, вызначаны ўсе віды (разнавіднасці) кваліфікацый і магчымасці іх прымянення па ўзроўнях і ступенях адукацыі, — дадала Вольга Олекс.

АДУКАЦЫЯ З АРЫЕНТАЦЫЯЙ НА РЫНАК

У сувязі з курсам на далучэнне Беларусі да агульнаеўрапейскай адукацыйнай прасторы ў папраўках, падрыхтаваных у Кодэкс «Аб адукацыі», прадугледжваецца ўвядзенне ў вышэйшай школе бакалаўрыята. Бакалаўрыят фактычна зойме месца цяперашняй І ступені вышэйшай школы, якая добра зразумелая наймальнікам. Таму пазнавальнасць дыпломам бакалаўраў у будучым забяспечана, чаго не скажаш пра дыпломы магістраў. Магістратура была ўведзена як надбудова над традыцыйнай вышэйшай адукацыяй, і ў чым заключаецца перавага ўладальнікаў дыпломаў магістраў перад спецыялістамі, наймальнікам пакуль не зразумела.

— Змест адукацыйных праграм на першай і другой ступені вышэйшай школы неабходна перагледзець і актуалізаваць, што звязана перш за ўсё з неабходнасцю вызначэння статусу магістраў і павышэння іх запатрабаванасці на рынку працы, — лічыць **начальнік нарматыўна-метадычнага цэнтра вышэйшай школы РІВШ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Святлана АРЦЕМ'ЕВА**. — Ступень арыентаванасці адукацыйных праграм на рынак працы з'яўляецца ключавым паказчыкам эфектыўнасці вышэйшай адукацыі і якасці падрыхтоўкі. **ВНУ павінны мець магчымасць адэкватна рэагаваць на змяненні структуры рынку працы, што ў істотнай ступені залежыць ад акадэмічнай аўтаномнасці ВНУ і магчымасці аператыўнага ўнясення адпаведных змяненняў у адукацыйныя праграмы**. Пытанне пашырэння правоў і адказнасці ўстаноў вышэйшай адукацыі — надзвычай актуальнае...

Што тычыцца колькасці спецыяльнасцяў магістратуры, то, на думку спецыялістаў, трэба перагледзець гэты пералік у бок узбуйнення спецыяльнасцяў.

ІНЖЫНЕР — ПРАФЕСІЯ ТВОРЧАЯ

Паколькі наша краіна з'яўляецца экспартна арыентаванай, то для Беларусі тэхнічная адукацыя мае выключна важнае значэнне. Патрэба ў высокакваліфікаваных спецыялістах расце, а патрабаванні да ведаў і прафесійных навыкаў становяцца ўсё больш жорсткімі. На шчасце, у апошнія гады вяртаецца цікавасць з боку беларускай моладзі да вышэйшай тэхнічнай адукацыі. Аднак вопыт сведчыць, што абітурыенты тэхнічных ВНУ менш інфармаваныя пра абраную спецыяльнасць, чым нацэленыя на паступленне ў медыцынскія, педагагічныя, сельскагаспадарчыя і творчыя ВНУ. Яны не могуць ацаніць уласныя здольнасці да інжынерна-тэхнічнай дзейнасці. Да таго ж і поспехі інжынераў вядомыя не так шырока, як, напрыклад, прадстаўнікоў творчых прафесій (акцёраў, музыкантаў, журналістаў і г.д.), таму значная колькасць абітурыентаў тэхнічных ВНУ мае вельмі аддаленае ўяўленне аб будучай прафесіі.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

У той жа час калі малады чалавек у школьныя гады захапляўся тэхнічнай творчасцю, то пры паступленні ў ВНУ ён ужо свядома выбірае спецыяльнасць, каб атрымаць паўнавартасныя веды. Як правіла, такія маладыя людзі працягваюць займацца навукова-тэхнічнай творчасцю і навуковымі даследаваннямі на новым, больш высокім узроўні. Таму **на канферэнцыі прагучала прапанова прадаставіць навучэнцам, якія добра праявілі сябе ў тэхнічнай творчасці, магчымасць для паступлення ў ВНУ па-за конкурсам**. Зараз конкурсаў у сферы тэхнічнай творчасці, па статусе прыраўнаваных да алімпіяд школьнікаў, у Беларусі няма, таму неабходная афіцыйная рэспубліканская сістэма мерапрыемстваў у галіне навукова-тэхнічнай творчасці навучэнцаў, якая б дазволіла прызёрам паступаць у любую тэхнічную ВНУ на льготных умовах. У якасці станоўчага прыкладу прыводзіўся Рэспубліканскі конкурс навукова-тэхнічнай творчасці «Тэхнаінтэлект», які праходзіць на базе БНТУ і дае магчымасць моладзі рэалізаваць сябе ў самых розных сферах навукі і тэхнікі.

ЧАМУ ВУЧЫЦЬ І ЯК ВУЧЫЦЬ?

Яшчэ адна праблема — дэфіцыт у ВНУ выкладчыкаў з новым узроўнем мыслення. Адзін з фактараў, які ўплывае на якасць адукацыі, — гэта, як ні дзіўна, узрост. Сёння ў ВНУ працуюць або выкладчыкі-пенсіянеры, або выкладчыкі, якія зусім нядаўна самі атрымалі вышэйшую адукацыю. У першым выпадку педагогі ўжо не жадаюць штосьці змяняць, упарта ігнаруюць сучасныя тэндэнцыі і працягваюць вучыць так, як і 20 гадоў таму. А ў другім выпадку адчуваецца адсутнасць як выкладчыцкага, так і прафесійнага вопыту і «сырасць» уласных ведаў.

Беларусі, як паветра, патрабуюцца людзі, здольныя ствараць інавацыйныя прадукты і тэхналогіі, і кіраўнікі, здольныя іх укараняць. Аднак у некаторых з удзельнікаў канферэнцыі ёсць сумненні наконт таго, ці зможа малады чалавек, якога і ў школе, і ў ВНУ вучылі рашаць тэсты, выбіраючы правільны адказ з пяці прапанаваных, прыдумаць інавацыйнае рашэнне? І ці зможа выпускнік вышэйшай школы, які ўсе гады навучання быў вымушаны рашаць выдуманыя педагогамі віртуальныя задачы, укараніць свае рашэнні ў рэальных умовах?

Надзея НІКАЛАЕВА ■

■ Сексалогія для ўсіх

АБОЕ ЗВЕРХУ,

ці Адкуль гэтыя расстройствы?

Сексолагі ўсяго свету сыходзяцца ў тым, што асноўная функцыя сексуальнасці — камунікатыўная. Эфектыўная рэалізацыя менавіта гэтай функцыі можа служыць асновай сексуальнага здароўя. На жаль, менавіта гэтая функцыя і парушаецца ў першую чаргу.

— Той мужчына, які сутыкнуўся з парушэннем эрэктыльнай функцыі і ў якога захаваліся добрыя стасункі з партнёркай, мае больш шанцаў вылечыцца, прычым за кароткі тэрмін, чым той, у каго няма зацікаўленых стасункаў з партнёркамі, — тлумачыць **загадчык сексалагічнага аддзялення Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Алег ХІМКО**. — Паспяховая камунікацыя — аснова працяглых і здаровых сексуальных зносін. Адсутнасць жа ўмення абменьвацца інфармацыяй аб сваіх пачуццях і намерах — адна з асноўных прычын сексуальных праблем.

Што перашкаджае партнёрскім стасункам?

1. Асаблівасці сучаснага выхавання. Большасць хлопчыкаў, якія выхоўваліся толькі маці, уваходзіць у дарослае жыццё з фемінізаванымі стэрэатыпамі паводзін. Дзяўчынкі ж, наадварот, — з маскулінізаванымі. Гэта праяўляецца на ўзроўні і звычайных, і сексуальных стасункаў. Між тым, ніхто не адмяняў сацыяльныя ўстаноўкі адносна таго, што мужчыны ў любым сэнсе павінны праяўляць актыўнасць. І тут навaспечаныя сямейныя пары сутыкаюцца з сур'ёзнай супярэчнасцю: выхоўвалі іх так, а ў соцыуме прынята інакш. Як трапна заўважыў адзін з расійскіх сексолагаў, «а ці магчымы палавы акт, калі абодва партнёры знаходзяцца зверху?». З цягам часу ў пары ўзнікае пытанне «Хто ў ложку гаспадар?». Разборкі падобнага кшталту, безумоўна, парушаюць сексуальную сферу.

Сексуальныя праблемы могуць прыводзіць да вельмі цяжкіх наступстваў — дэпрэсіі, разводу, залежнасцяў і г.д. Для многіх мужчын секс з'яўляецца адной з галоўных каштоўнасцяў жыцця, і чым большае значэнне надаецца апошняму, тым з большым драматызмам перажываюцца парушэнні. Таму, калі ўзнікаюць праблемы, — вырашайце іх, звяртайцеся да спецыялістаў.

2. Суб'ектыўныя ацэнкі паводзін партнёра. Адрозненне паміж чаканымі і рэальнымі паводзінамі партнёра могуць стаць сур'ёзным фактарам разладу і нават справакаваць такія сексуальныя парушэнні, як адсутнасць аргазму ў жанчын і страта эрэкцыі ў мужчын. Звычайна калі пасля няўдалых спроб сексуальнай блізкасці пары спрабуюць абмеркаваць сексуальныя праблемы, атрымліваецца поўнае непаразуменне, якое пацыенты апісваюць прыкладна так: «Мы кажам пра адно і тое ж, але на розных мовах», «Мы хочам аднаго і таго ж, але паводзім сябе па-рознаму», «Я кажу, што кахаю яе, а яна мне ў адказ: «Што ты на мяне крычыш?»

3. Каментарыі не да месца. Колкія заўвагі і каментарыі наконт «сексуальнай непаўнацэннасці» партнёра могуць прывесці да сур'ёзных сексуальных праблем у выглядзе сфарміраванага «сексуальнага неўрозу» або «сіндрому трывожнага чакання няўдачы». У такім выпадку арганізм адмаўляецца функцыянаваць у аўтаномным рэжыме, фарміруецца кантроль над уласнымі сексуальнымі функцыямі, што прыводзіць да цалкам процілеглага выніку — адсутнасці эрэкцыі або аргазму. Вось і атрымліваецца: «Калі б мая жонка не гаварыла, што ўчора я быў «супер», а сёння нешта слабаваты...», «Калі б мой муж пастаянна не распытваў, ці быў у мяне аргазм...».

4. Боязь абмеркавання сваіх пачуццяў. Многія жанчыны абсалютна не шчырыя ў ложку — стрымліваюць свае эмоцыі, дэманструюць «холад» або імітуюць аргазм. Празмернае жаночае дамінаванне таксама можа стаць прычынай сексуальнага расстройства — як у жанчын, так і ў мужчын. Такія жанчыны, як правіла, на вядучых ролях і ў грамадскім жыцці, пры высокіх пасадах. «У жонкі нават у ложку працягваецца работа, — кажа адзін з пацыентаў. — Я не чую ад яе ніводнага пяшчотнага слова. Секс у нас па яе патрабаванні з дакладнымі ўказаннямі і інструкцыяй, што я павінен і чаго не павінен рабіць... А я ўсё ж такі не машына».

Сексуальныя расстройствы сустракаюцца прыкладна ў 80 працэнтаў людзей з псіхічнымі захворваннямі (трывожнымі расстройствамі, расстройствамі асобы). Сексуальныя расстройствы рознага кшталту (зніжэнне сексуальнага жадання, задавальнення, знікненне эрэкцыі, аргазму і інш.) сустракаюцца ў 60 працэнтаў пацыентаў з дэпрэсіўнымі расстройствамі, 55 працэнтаў хворых на алкагалізм і 85 працэнтаў нарказалежных.

5. Празмерны эгаізм. У сучасным свеце шлюбныя партнёры ўсё часцей скардзяцца на тое, што ў іх нават ніхто

не пытаецца, ці гатовы яны да сексу ў пэўны момант. Маўляў, падыход адзін: «Ну, вось паелі — цяпер у ложак». Яны нават не распытваюць адно аднаго, хто стаміўся, у каго якія жаданні...

Святлана БАРЫСЕНКА

■

АДНА ЛІТАРКА, А ПРЫГОД...

Колькі гадоў чытала я звяздоўскія «вясёлыя праўдзівыя гісторыі» ды шкадавала, што ў маім жыцці не здаралася нічога такога, каб і самой пасмяяцца, і людзей пасмяшыць...

Але ж загучалі (на бяду!) назвы гарадоў — Славянск, а потым Данецк, і я кажу свайму мужу, што была ва Украіне, а ў Славянску нават па вуліцах хадзіла. Ён дужа здзівіўся, пытае: «А калі гэта?» Расказала, а потым падумала: «Чым не гісторыя для вашай і нашай газеты, для ўсімі любімай рубрыкі?» Бо яно ж і праўда, і смешна, і нават страшнавата...

У тое лета мы са стрыечным братам Іванам (я амаль другакурсніца педінстытута, ён — фізкультурнага тэхнікума) упрасілі бацькоў адпусціць нас у госці — на Кубань, да цётачкі Ніны.

Не адразу яны згадзіліся, але ж потым далі па 75 рублёў (гэта многа, бо стыпендыя была 28), сабралі нейкіх гасцінцаў, і мы паехалі — у белы свет, можна сказаць. Бо нас зусім не насцярожыла (далей Гродна нідзе не былі), што кампасцірааць білеты прыйшлося ў Мінску (а цётка ж, прыязджаючы, казала, што робіць гэта ў Маскве), што едзем мы ў такім прыгажэнным экспрэсе «Мінск—Сочы» (фотаапарат з сабой мелі, дык нават здымак застаўся), што з намі ў адным купэ — хахлушкі, якія частуюць ракамі, што на прыпыначных станцыях прадаюцца паўднёвыя фрукты — прычым вёдрамі, а папрасілі з братам кілаграм, дык нам без грошай далі...

Самы час раскрыць інтрыгу, сказаць, чаму наш шлях ляжаў па Украіне, у той час як збіраліся мы на Кубань. Падвяла нас літарка, прычым адна: нам трэба было патрапіць у СлавЕнск, а білеты ўзялі да... СлавЯнска.

І туды ж прыехалі! Вось яна, доўгачаканая станцыя...

Праўда, нас ніхто не сустракае. А чаму?

Круцімся туды-сюды, глядзім, просім у людзей:

— Скажыце, а як дабрацца да станіцы Грывенская?

На нас глядзяць ва ўсе вочы, кажуць:

— Ды няма тут ніякіх станіц.

— Што значыць — няма? — абураецца брат. — А куды мы прыехалі?

— На Украіну...

Як мыла з'еўшы, пацягнуліся на вакзал — да кас. Зноў купілі білеты, зноў паехалі (да таго ж з дзвюма перасадкамі, з начоўкай у гасцініцы)...

Карацей, да цёткі мы ехалі вельмі доўга.

...Гасцяванне ў яе запомнілі на ўсё жыццё, бо, ратуючыся ад спёкі, спалі на падлозе, на пярынах, ад'ядаліся баршчамі і варэнікамі, абпіваліся халоднымі кампотамі з абрыкосаў і персікаў. Глядзелі, як на гародзе растуць кавуны і дыні, як на падворку ўецца вінаград...

А яшчэ мы цэлымі днямі прападалі на рэчцы, плюхаліся ў вадзе. Я, праўда, выключна на камеры, бо плаваць зусім не ўмела...

Станічнікі ў гэта паверыць не маглі, бо ў іх хіба што немаўляты не плавалі... А тут такая вялікая дзеўка і раптам на камеры. Думалі, я для прыколу... Каб увагу хлапцоў прыцягнуць... Ну і перакулілі...

Больш за ўсё я крыўдавала тады на брата: ён жа ведаў, што магу патануць, а ўсё роўна смяяўся... Разам з усімі...

Карацей, прыгод у нас было з галавой. Вярнуўшыся дамоў, расказалі бацькам пра многія, пачаўшы з таго, як дабіраліся — туды.

Тата адразу ж разлажыў на стале карту, знайшоў на ёй такі вядомы цяпер Славянск і, пачухаўшы патыліцу, сказаў:

— Мне дзіва, як вас у Сібір не занесла? Там яшчэ адзін Славенск ёсць!

...А можа, і Славянск. Цяпер ужо не помню.

Г. Пятроўская,

в. Ардашы, Смаргонскі раён

ПРАСІЎ?.. АТРЫМЛІВАЙ!

Мой сябар Аляксандр — цудоўны камп'ютаршчык. У яго кабінеціку чаго толькі няма!.. І кожны з агрэгатаў ён ведае як свае пяць пальцаў. Таму да яго і звяртаюцца.

Дык вось. У чарговы раз адчыняюцца дзверы ў той кабінецік, заходзіць незнаёмец. Пачынае, як многія: мне, маўляў, параілі да вас звярнуцца, сказалі, што вы можаце дапамагчы... Мне б пару старонак вывесці... На прынтары... Ці як яго там — я не ведаю. Гэта сыну трэба, у школу.

— Я б з задавальненнем, але давайце заўтра, — прапануе Саша. — Сёння ў катрыджы тонеру няма.

Набор незнаёмых слоў заганяе незнаёмца ў ступар. Ён напружана моршчыць лоб, спрабуючы зразумець, пра што тут гаворка.

«Трэба неяк больш даступна яму сказаць», — думае Саша і паказвае на прынтар:

— Чарніла скончылася... Разумееш?

— А-а... Чаму ж не! — ззяе ад радасці госць. — Зараз зраблю.

Хуценька, без лішніх слоў, ён кіруе да дзвярэй, пакідае кабінет.

«Дзівак нейкі, — думае Саша, — у камп'ютарах нічагуткі не цяміць, а тонер знайсці бярэцца. Дзе?

Над гэтым пытаннем доўга разважаць не прыйшлося, бо хвілін праз колькі візіцёр вярнуўся: шпарка зайшоў у кабінет і, азірнуўшыся на дзверы, дастаў з кішэні... «чарніла» — наша, пладова-ягаднае...

Саша паспрабаваў было тлумачыць, што гэта зусім не тое, але прасіцель нават слухаць не хацеў. Ён быў шчыра абураны: маўляў, прасіў чарніла, дык атрымлівай! Абяцаў зрабіць? Дык рабі!

А як ты зробіш, калі катрыдж і сапраўды пусты?

Давялося Сашу ісці да знаёмых і раздрукоўваць тыя старонкі як для сябе самога.

Анатоль Палынскі,

г. Беразіно

ЯКІ ДУБ — ТАКІ І КЛІН...

Прыгожае слова «вяселле»! Лепшае, каб і хацеў, мусіць, не прыдумаеш, бо столькі ў ім усяго...

А галоўнае — весялосці...

Праўда, цяпер, на мой погляд, яна нейкая... абмежаваная. Бо амаль на кожным — і прывычная кавалькада легкавушак, і прафесійныя вядучыя, і тыповыя віншаванні... Адны і тыя ж анекдоты, гульні. І ўсё гэта для пэўнага кола гасцей — не болей... Раней жа, яшчэ ў 50—60-я гады мінулага стагоддзя, на вясковых вяселлях хто толькі не гуляў!

Ну ў прыватнасці: жанкі туды ішлі, каб паспяваць адмысловыя песні, дзяўчаты — каб паўглядацца на строі вясельнікаў ды пафарсіць сваімі, каб пазнаёміцца з новымі кавалерамі; дзеці, каб налавіць цукерак, якія сыпала нявеста, мужчыны і юнакі — каб пад настрой кінуцца ў скокі, «адарвацца па-чорнаму», як «слэнгуе» сучасная моладзь, і, вядома ж, каўтануць гарэліцы, якую будуць наліваць усім прысутным...

Дык вось чарговае вяселле ў суседняй вёсцы і той самы чаканы час: бацька маладога выносіць на вуліцу колькі пляшак гарэлкі, талерку з закускай... Спачатку частуе жанчын-пяюх. Тыя — па чарзе, трохі прыгубіўшы гарэлкі, — мігам разбіраюць прысмакі...

Пачастунак даходзіць да мужчын. Ім, як вядома, закусь не так і патрэбна. Але ж «прыкалоцца» можна, ахвочых да гэтага шмат. У той кампаніі гэтая роля за Пятром была. Да вяселля ён паспеў ужо папрацаваць, пажыць у вялікім горадзе, што-кольвек пабачыць там — у піўных. А значыць, і тут змог носам пакруціць. Сказаў:

— У маладога — гарэлкі многа...

А потым, трохі счакаўшы, дадаў:

— Закуска знікла маланкай, дык заядаць давядзецца шклянкай?

Прагаварыў так, шклянку спустошыў і... адкусіў кавалак шкла.

Ва ўсіх, што называецца, сківіцы адвіслі, мову адняло!

— Ну ты шкларэз! — праз паўзу прамовіў нехта з прысутных.

— Пятро, сынок, не калечся! Прынясу я нечага з'есці, — напрамілы Бог папрасіў гаспадар і подбегам кінуўся ў кухню...

Праз хвіліну-другую ён і праўда вынес талерку з закускай — паўнюткую, з коптурам...

Было што хлопцам выпіць... Было чым закусіць. І, вядома ж, засталося, што ўспомніць, бо Пятрок той (ці трэба казаць?) на ўсё жыццё застаўся Шкларэзам.

І дзеці яго «шкларэзавы», і ўнукі таксама...

Альфрэд Тычко,

в. Ідолта, Мёрскі раён.

ТОЕ, ШТО ДОКТАР ПРАПІСАЎ!

Было гэта даўным-даўно. «Пашчасціла» мне: трапіў у 5-ю сталічную бальніцу. Не ведаю, як цяпер, а тады мая хірургія была побач з гінекалогіяй. І якраз у гэтым аддзяленні працаваў мой добры знаёмец, можна сказаць, сябрук. Грэх было, трохі ачуняўшы, не схадзіць у ардынатарскую, не даведацца, калі ён дзяжурыць, а потым вечарком не зайсці, не пагаманіць.

І вось я выправіўся, іду памалу, бо на дзвюх мыліцах (я — інвалід), але ж досыць упэўнена, бо дарогу ведаю...

Бачу — насустрач мне кабета выпаўзае: збляднелая, у крук сагнутая, за ніз жывата трымаецца, ногі ледзь перастаўляе...

Але ж — не была б то баба — пакамандаваць усё роўна хоча!

— Вы не туды ідзяце! — кажа мне. — Тут гінекалогія.

Мяне ж як сам чорт за язык тузануў:

— А мне сюды і трэба, — адказваю ёй. — Я — трансвестыт.

Ніколі не думаў, што на гэтае, тады рэдкае слова, будзе такая рэакцыя! Хваравітасць як рукою зняло! Жанчына забылася на свой жывот і ледзь не зайшлася ад рогату... Прычым смяялася так...

Заляпалі дзверы палат — павысоўвалі галовы іншыя хворыя... Выйшаў на шум і знаёмец-доктар.

— Паверыць не магу, — сказаў мне потым, — я гэтай хворай чаго толькі не прызначаў, а ёй усё роўна жывот балеў! А ты, бач, за імгненне вылечыў...

А ўсё чаму?

Таму што смех — найлепшае лякарства!

Ілья Шахрай,

г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж: *Вы яшчэ не думалі, што прыгатаваць да любімых свят? Мы — таксама. А вось што «паставіць» у навагодні нумар, — задумы ёсць. Далучайцеся! У рубрыцы «Народ на провадзе: ноч перад Калядамі» раскажыце, напрыклад, пра свой самы памятны падарунак, прыгоду, падзею, сустрэчу — пра тое, што адбылося альбо магло...*

Будзем чакаць! Пішыце!

І яшчэ — не забудзьцеся падпісацца... Каб чытаць — у родным краі, на роднай мове, родную газету.

■ Асабістае

ЦЮПКА

Надоечы паехаў на сваю Лепельшчыну на спадарожнай легкавушцы. А выехалі зарана, з цемрай. І даехаў да паварота з шашы на сваю дарожку, калі яшчэ і промень не прабіўся праз восеньскую вату аблокаў — хоць вока выкалі. Волгла, золка... Ускінуў на спіну рэчавы мяшок і зрабіў колькі крокаў, нібы па вадзе, калі асмельваешся пакупацца.

Напачатку трэба было перайсці лясок — невялікі, але ж у густой цемры ўсё адно няўтульны. Дык згадаліся словы аднаго святара, які казаў мне: «А як выпадзе ісці ноччу па лесе і страх агарне, дык расхініце рукі ўшыркі, жывым крыжом станеце — нячысты дух і адліпне...» Прыгожы сродак, але навошта ён мне тут, на дарожцы, якая помніць мае дзіцячыя слядочкі?

Ды і лес неўзабаве скончыцца, пачуецца цурчэнне Камяннога ручая, а там — і пагорак, з якога адкрываецца наша вёска.

Адкрывалася... Якой цемрай, было, ні падыйдзі — вёска прыветліва падміргвае агнямі, а то і азываецца маладымі галасамі. Цяпер — толькі цемра.

Я міжволі прыспешыў крок, каб паглядзець: а можа, у Гамзючыхі цепліцца агеньчык?.. Бывала ж, калі ні ўстань, хоць за гадзіну, хоць за дзве да світанку — у ейнай печы ўжо весела скача па бярозавых цурбачках ды аскепках агонь. Цётка была ранняй птушкай. Прайшоў колькі крокаў і стаў як укопаны: была... Але ж даўно памерла...

А можа, нявестка ўстала па гаспадарцы ўходжвацца?

Ат, садовая галава, у маладых вяскоўцаў даўно хлеўчукі пустыя, толькі скразнякі з кута ў кут гуляюць. Маладзёны крамным перабіваюцца...

Мне захацелася як мага хутчэй затуліцца ад гэтай, такой адчужанай роднай прасторы, і я пачаў таропка шукаць па кішэнях ключы ад роднай хаты, балазе да яе заставалася — толькі вуліцу перайсці.

❍❍❍

Я прыехаў на радзіму не таму, што «трэба дома бываць часцей», а каб падрыхтаваць трохі сваю не надзеленую вялікай увагай хату да зімы. Трэба было бracца за справу, каб падчас яе ў каторы раз пераканацца: ніводзін карэньчык повязі з мінулым тут не абарваны.

...Калі памёр бацька і я прыязджаў дадому праведаць маці, дык зноў і зноў здзіўляўся, колькі працы перарабіў мой татулька за сваё жыццё. Куды ні зірні на сялібе — усюды плён яго рук. Каля хаты — пасаджаны ім сваім часам сад, за садам — зрубленая ім лазенька, на панадворку — пуня і хляўчук... Але больш за ўсё мяне ўражваў яловы плот, якім бацька, каб не нарабілі шкоды каровы ды авечкі, абгарадзіў увесь наш вялізны, у 60 сотак, агарод. Колькі жэрдак трэба было абчасаць, колькі слупоў укапаць!.. І ўсё адзін, адзін: няхай сынок вучыцца сабе, чытае, піша...

Я зноў і зноў ганарыўся бацькавай дужасцю ды працавітасцю, згадваў, што ў свой час ён быў першым касцом у калгасе, раскладаў ушыркі ды ўзнімаў угору самыя вялікія вазы сена ці жыта, калі звозілі пад шаху. Ведаць не ведаў выслоўя: «Калі працуеш у купе, не баліць у пупе...»

Гонар за бацьку я ніколі не выстаўляў на людзях, нібы ціхай малітвай, напаўняў ім сваю душу, калі быў сам-насам. Можа, дзеля таго, каб трохі зацвердзіцца ў спадзяванні, што і мне — яшчэ пакуль не позна — большай мерай перадасца яго працавітасць, няхай сабе і ў зусім іншай сферы дзейнасці.

Трохі цешуся з таго, што да пенсіі паспеў нанова перакрыць і абшаляваць нашу хатку, чым заслужыў пахвалу маці: «Во, ты тое зрабіў, што бацька не паспеў...» — аднойчы сказала яна. Можа быць, гэта самы лепшы мой працяг.

А сёння зусім іншыя пачуцці напаўняюць сэрца, калі я азіраю нашу сялібу. І не толькі таму, што здзічэў недагледжаны бацькаў сад, падгніў, упаў вобзем і расцяганы вяскоўцамі на дровы яго плот...

Я іду па дровы, каб прыцепліць грубачку, і зноў, нібы аб прытоены ў траве пянёк, спатыкаюся аб незагойную думку: «А гэта ж матуля, калі засталася на сялібе адна, збіла з аполкаў вялізны дрывотнік і гаспадарчую прыбудовачку, і катушок адгарадзіла ў хляве, і перагародку паміж хатай і пуняй узвысіла, каб зацішней на дзянніку было... А дзе я тады боўтаўся са сваім мужчынскім спрытам? Ачмураны галоснасцю, пісаў пра перабудову краіны?..»

Самадакор і крыўда на сябе за недаравальную правіну перад маці вострымі кіпцюрамі пачынаюць драпаць маю душу. І нікуды ад гэтага не схавацца. Хіба што распачаць працу...

І я бяруся мыць ды прыстаўляць на зіму падвоеныя рамы.

❍❍❍

Як казала маці, іх зрабіў і зашкліў бацька, хоць і быў няўмекам у сталярнай справе, як кожны адданы свайму лёсу «пан сахі і касы». Проста не выпадала замовіць іх майстру — не было грошай, бо на калгасныя працадні выдавалі добра калі жыта ці пшаніцу, а не гірсу. Бацька нагледзеўся, як майструе спрактыкаваны сталяр, і ўзяў у рукі гебель.

Натуральна, што рамы адштукаваны не надта спрытна — трохі грубаватыя, ды і падагнаны да абсады не цюцелька ў цюцельку... Але ж затое помныя, ды і перажыў я за імі сцюдзёныя зімы ў маленстве ды юнацтве, як у Бога за пазухай...

І шыбы ў гэтых рамах адметныя — некаторыя не суцэльныя, а складзеныя з дзвюх, запушчаных адно за адно, шкельцаў. І зноў жа прычына такой ашчаднасці тая ж — не хапала грошай. Замяніць гэтыя шыбы сёння — усё адно што ацуравацца кранальных згадак мінулага.

Шмат што ў роднай хаце нагадвае мне пра незаможнае, а часам і нішчымнае жыццё бацькоў. Але гэта мяне і засмучае, і адначасова трохі супакойвае, нават апраўдвае. «Не толькі ж багацце, але і беднасць перадаюцца ў спадчыну, — думаю сам сабе. — Дык хіба павінен я засмучацца, што за ўсе свае пражытыя дзесяцігоддзі не нажыў капіталу, здавальняўся толькі «атрыманым» за сваю працу ад дзяржавы, не ганяўся за доўгім рублём, бо не ведаў, навошта ён, не махлярыў, ні ў каго не вучыўся хітрай навуцы зарабляць грошы, а вучыўся ў аднаго савецкага паэта жыць нават без неабходнага, каб не адмаўляцца ад лішняга. А калі мае дочкі вымушаны гэтым засмучацца, дык гэта мая віна — недавыхаваў».

❍❍❍

Між тым за вокнамі пачало змяркацца, а мне трэба было яшчэ памыць стол над печчу — над каптуром і ляжанкай, на якой так любіла самотнымі зімовымі вечарамі пагрэцца мама, а то і заснуць да раніцы. «А што там мыць? — падумаў я. — Пятачок застаўся. Рукі высока ўгору ўздымаць не трэба — наадварот, карчаком на ляжанцы давядзецца ўпраўляцца, усё адно як хмару навіслую шараваць...»

Запаліў цьмяную, укручаную мамай дзеля «эканоміі» лямпачку і ўзлез на печ. А тут — ейныя старыя апранахі, пачэпленыя на цвічок каснікі, цёплыя тэпці на пяколку, нібыта ўчора пастаўленыя, каб падсохлі ды нагрэліся... І стала мне так мулка, няўтульна, як у яме, прыкра на халоднай печы, што вырашыў адкласці работу на заўтра.

Заварыў сабе кавы, каб узбадзёрыцца, закурыў і напоўніўся думкамі пра тое, што нашая хата сёння — найперш гняздзечка мамінай душы, з якога ёй адлятаць у вечны вырай. З роднай хаты, а не з гарадской кватэры сваім часам павязу я матулю на клады да бацькі і сястрыцы, а вось тут, пад абразамі, дзе ў складках ручніка затоены ейны шэпт, паплачу і паслухаю словы вясковых бабулек пра Ірыніну шчодрасць ды спагадлівасць...

Гэтыя думкі зусім не страшылі мяне — наадварот, толькі супакойвалі.

«Усё трэба планаваць!» — любіць казаць мая мама, і я за ёй, са спасылкаю, а за мной — мая малодшая дачка Вераніка.

❍❍❍

Назаўтра маю адзіноту сцёр, не раўнуючы, як я, пыл са столі, сябра Пятрок. Яго бацькоўская хата стаяла непадалёк ад нашай... Шмат што нас лучыць: і год, і месца нараджэння, і супольная вучоба, і нават тое, што да калгаснага ладу нашы дзяды мелі аднаго супольнага канька на свае зямельныя «шнуркі». Так атрымалася: ваўкі загрызлі цяглавых жывёлін, а каб набыць новых, у гарапашных гаспадароў не хапала грошай, дык і скінуліся на аднаго канька. Але нават не агульны корань сялянскага лёсу нас сілкуе, а лёгкі суплёт думак, незацыкленасць на грошах і аднолькава моцнае захапленне прыўкрасамі Божага свету ды гожасцю Яго людзей. Нам заўсёды ёсць аб чым пагаварыць. І памаўчаць — таксама.

Выпілі з Петраком па чарачцы — болей ужо ні маё, ні яго нутро не прымае (а можа, і па дзве, не памятаю). І тут я, разамлелы ад стомы, якую разнёс па целе вясёлы напой, раптам падчапіў у нетрах памяці зусім даўнюю згадку, засеўшую там хоць і не балючай, ды ўсё ж стрэмкай.

— Пятрок, а памятаеш, як мы з табой, жаўтароцікі, зайшлі аднойчы пагуляць да бабы Гелены?..

— Ну...

— А памятаеш, як яна пачаставала нас цюпкай?..

— Ну...

— А скажы мне, чаму ты тады наваліўся на тую цюпку, усё адно як з галоднага краю прыехаўшы? Як ты яе мугаў, як мугаў! Лыжка бліскавіцай мільгала, а ў цябе за вушамі трашчала... Я ад здзіўлення той наедак да рота не мог паднесці...

Перад тым, як напісаць, што адказаў мне Пятрок, павінен сёе-тое распавесці пра бабу Гелену ды і пра цюпку — для зусім маладзенькіх.

Баба Гелена жыла адна ў цэлым свеце — не мела ні мужа, ні дзетак, хіба толькі далёкіх свайкоў. Перацірала дні, як птушка, што адбілася ад чарады. У прыжывалы ні да каго не ішла, хоць сваякі і запрашалі пад свой дах. Перабудзе лютыя маразы і, ганарлівіца, — назад у сваю хату. А больш дакладна — у хацінку, маленечкую, з акенцамі, як галаве ўлезці, з яшчэ земляной падлогай і толькі з самым неабходным побытавым начыннем.

Гелену ў вёсцы ўсе шкадавалі, чым маглі частавалі, ласавалі гасцінцамі. Асабліва Петракова маці: зварыць што-небудзь — і цераз дарогу да Гелены з цёпленькім.

Набіліся мы «на госці» да Гелены, калі былі ўжо васьмігадовымі хлопчыкамі, вучнямі пачатковай школкі. Карцела паглядзець на Геленіну земляную падлогу, бо ў нас ужо былі насланыя з дошак.

Мы рассмяяліся і на душы маёй стала лёгка.

❍❍❍

...Не хацелася разыходзіцца. Дзіўна, але нам зусім не надакучала гаварыць пра цюпку і нават заманулася прыгатаваць яе. Пятрок прыгадаў, што цюпка робіцца яшчэ смачнейшай, калі трохі пастаіць: хлеб у вадзе размякае, крошкі ападаюць на дно місы, а там яшчэ — драбкі цукру; дык у апошніх лыжках — самы ласунак!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

І тут бабця хуткай рукой прыгатавала пачастунак.

Цюпка — страва для самых бедных. Калодзежная вада, трохі падсаладжаная, і накрышаны ў яе (абавязкова рукамі, а не накроены нажом, бо так смачней) хлеб...

Да таго часу я прачытаў ужо славутае апавяданне Змітрака Бядулі пра нашае вясковае ды і местачковае нішчымнае жыццё «Пяць лыжак заціркі». Вось і глядзеў на сябра, як на злыдня, які аб'ядае бедную бабу Гелену. Адна лыжка, другая...

— Дурань ты, — адказаў мне Пятрок. — А чым жа ў бабы Гелены можна было паласавацца, апроч цюпкі?

А я згадаў зусім іншую цюпку, якую, каб перамяжыць голад, іншым разам рабіла мая мама, калі вярталася з поля і неўзабаве трэба было бегчы сустракаць карову ды ўходжвацца па гаспадарцы. Помню, не салодкая тая цюпка была, а салёненькая, з дабаўленымі да хлеба крышанамі цыбулькі. Простая, як праўда быцця, страва! Голад смаку не пытаецца...

І тады я вырашыў патэлефанаваць жонцы, каб пераказала маці, што заўтра ўжо буду ў Віцебску — Пятрок падвязе. Не ўтрымаўся і запытаўся ў сваёй сужанкі, ці рабілі ў іх цюпку, ці ела яна гэтую незабыўную, як маленства, страву...

— Цюпкі? А як жа. Крышылі пячэнне, абараначкі маленькія салодкія і залівалі малаком.

— Ого, мондрыя вы! У нас дык хлеб на вадзе...

— Ну мы ж не правінцыя, а Цэнтральная Беларусь. Нашу гаворку за аснову літаратурнай мовы ўзялі! — дала волю сваёй ганарыстасці жонка.

— Здаюся... — адказаў я.

А сам ледзь не пырскнуў ад смеху: бач ты, цюпку «цюпкамі» завуць, «літаратары» невыводныя...

Ды і вёска ейная — Спічнік! Што там, спіцы ў колы рабілі ці хварсістыя кавалеры сярнічкамі перад носам адно ў аднаго, каб пазлаваць, трэслі?..

❍❍❍

Еду з Петраком у машыне, чытаю яму напісаныя ў роднай хаце старонкі.

— Ат, і пра гэтае напісаў, і пра тое... — кажу. — Цюпка атрымалася.

— Але ж, мне здаецца, не на вадзе, а на рошчыне тваёй душы, — падтрымлівае мяне сябра.

Няхай сабе, калі так...

Сяргей РУБЛЕЎСКІ

■

Наш культурны асяродак

Жырандоля

Выпуск № 38 (255)

■ Свята ў хату

КАЛАСКІ АД КОЛАСА

Скарбонка памяці паэта папоўнілася новымі аўтографамі і архіўнымі дакументамі.

Гэта былі падарункі, з якімі прыходзілі госці на 55-годдзе музея Якуба Коласа. Унучка сябра пісьменніка па Нясвіжскай семінарыі, якая жыве ў Грузіі, напрыклад, прывезла кніжку з аўтографам Коласа. Зборнікі архіўных дакументаў з Расіі таксама могуць быць цікавымі для даследчыкаў творчасці пісьменніка, якія перыядычна збіраюцца на «Каласавіны» пад кіраўніцтвам акадэміка Міхася Мушынскага. Але падарункаў было шмат: дзень нараджэння музея — цудоўны момант для папаўнення фонду, які налічвае 34 тысячы прадметаў. І гэта момант для сустрэч, якімі славіўся Дом Коласа яшчэ пры жыцці яго гаспадара: тут збіралася творчая інтэлігенцыя, ладзіліся вечарыны. Усіх прымалі з душой.

Са студзёнай вуліцы заходзіш у дом — і адразу цяпло ахінае. У чацвер вечарам віталі ў Доме Коласа з музыкай і каласкамі. Маленькі сімвалічны букецік каласочкаў з сіняй стужачкай. Пазначылі: гэта свае, святочныя людзі. Сапраўды, на 55-ы дзень нараджэння Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа прыходзілі тыя, хто меў дачыненне да арганізацыі музея (у першую чаргу гэта прадстаўнікі сям'і пісьменніка), хто працаваў у ім і хто працуе сёння і дапамагае музею як сябар.

У гэтым доме Якуб Колас жыў з 1944 па 1956 год. Тут ён памёр 13 жніўня 1956 года. А ўжо 16 жніўня выйшла пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР аб стварэнні музея ў доме, дзе жыў Якуб Колас. Гэта стала магчыма ў першую чаргу дзякуючы рашэнню сыноў пісьменніка — Данілы і Міхася Міцкевічаў. Менавіта Даніла Міцкевіч знайшоў гэты дом для бацькі пасля вызвалення Мінска і заняў яго з дазволу кіраўніцтва Акадэміі навук БССР. Сам Колас прыехаў у сталіцу ўпершыню пасля вызвалення 6 снежня 1944 года, але канчаткова пераехаў з Масквы ў маі 1945 года пасля смерці жонкі Марыі Дзмітрыеўны. Даніла Канстанцінавіч быў вельмі актыўным рупліўцам захавання памяці пра свайго бацьку і заснавальнікам музея, а Міхась Канстанцінавіч дагэтуль жыве зусім побач і актыўна прымае ўдзел ва ўсіх музейных імпрэзах і наогул тых, якія ладзяцца ў гонар пісьменніка.

Сёння музей Коласа сучасны, напоўнены тэхнікай, якая дапамагае зразумець сутнасць творчасці народнага паэта. Тут нават гукі ствараюцца такія, каб была асаблівая атмасфера, нібыта ходзіш па жывым будынку, які дыхае. Ходзіш і ўяўляеш, што вось жа Пясняр, побач. Насамрэч часткова такое адчуванне ўтвараецца з-за таго, што ў доме захаваны інтэр'ер, рэчы гаспадара. Усё, чым ён карыстаўся, — ложак яго, стол, крэслы, нават посуд (нібыта чакаюць гасцей).

Гасцей насамрэч чакаюць ва ўсіх філіялах музея Якуба Коласа: у Акінчыцах, Альбуці, Ластоку, Смольні. І калі праехаць па тых мясцінах, дзе паэт нарадзіўся і сталеў, а потым завітаць у Дом Коласа ў Мінску, то можна атрымаць больш поўнае ўяўленне пра чалавека і асобу, у якой у жыцці было столькі клопату пра іншых, дзеля каго ён пісаў, сядзеў у турмах, мысліў і рабіў канкрэтныя справы, каб дапамагчы людзям, калі меў такую магчымасць. Ён заўсёды быў рад, калі прыходзілі да яго. Прыходзяць і цяпер. На дзень нараджэння музея сабралася вялікая грамада — прадстаўнікі Міністэрства культуры, навукоўцы, пісьменнікі, мастакі, музейныя работнікі, музыканты, прадстаўнікі яго малой радзімы, людзі, якія працуюць на зямлі. А ўсіх аб'яднаў творца, які пісаў пра нешта такое, што агульнае для ўсіх, што робіць нас усіх народам.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Паслясловуе

Лепшая прэмія для тэатра — поўныя залы на спектаклях

Нататкі справакаванага аматара

«Нацыянальная тэатральная прэмія» — свята, якое не заўсёды з намі. Яго чакаеш некалькі гадоў (каб назапашваліся добрыя спектаклі, з якіх можна выбраць лепшыя). Чакаеш, каб не тое што паглядзець гэтыя спектаклі, — хто любіць тэатр, той сочыць і ведае, што вартага з'явілася за апошнія гады. І ты гаворыш пра гэта іншым. Але часам тваіх слоў мала, бо людзі сёння «вядуцца» на шыльды, на брэнды. На званні і заявы: вось калі нейкі спектакль адзначаны нечым, тады — іншая справа. Трэба ісці. Таму свята гэтага чакаеш, хутчэй, для таго, каб сказалі і павесілі шыльду «лепшы» на тое, што сапраўды добра, а галоўнае, з сэнсам створана. Гэтае свята — правакацыя для гледача, які схопіць інтрыгу і пойдзе глядзець.

Сёлета «Нацыянальная тэатральная прэмія» стала суцэльнай інтрыгай. Найперш з-за таго, што быў зменены фармат, у адрозненне ад двух папярэдніх разоў, калі існавала ўмоўная тэатральная акадэмія — шырокае журы, у якое ўваходзілі прафесіяналы з самых розных тэатраў краіны. Сёлета ад гэтага адмовіліся, і **журы стала больш лакальным, прычым у кожнай з намінацый сваё**. І калі ёсць канкрэтнае журы (не 120 чалавек), то так і хочацца сказаць: «Агучце, калі ласка, увесь спіс». Не, ну, каб ведаць, з каго спытаць за вынікі. (Ці ад меркавання каго адштурхоўвацца). Таму што гэта ж не спартыўныя спаборніцтвы, дзе аб'ектыўна лепшы той, хто прыбег першы (і тое ўмудраюцца аспрэчваць вынікі, калі ёсць момант несумненнасці). Тут усё вельмі індывідуальна і суб'ектыўна, бо ў людзей розныя густы (нават калі яны эксперты), розныя меркаванні пра развіццё і стан сучаснага тэатра. Розныя думкі пра тое, што ёсць «добра». Момант адноснасці меркаванняў у лакальным складзе журы і ў больш шырокім праяўляюцца, пэўна, па-рознаму. У варыянце «тэатральна акадэміі» было больш надзеі на тое, што ён можа быць знівеліраваны. Цікава, што бадай аднолькава глядзяць на гэта два знакавыя рэжысёры, што высветлілася на пасяджэнні выніковага «круглага стала» па Нацыянальнай тэатральнай прэміі. Адзін з іх, Мікалай Пінігін, які вылучаўся на Нацыянальную тэатральную прэмію, але не быў сярод лаўрэатаў. А другі — трыумфатар самага першага конкурсу Аляксандр Гарцуеў. У іх розныя перадгісторыі адносін з гэтым конкурсам, але аднолькавае меркаванне наконт таго, чаму павінна быць прэмія, якую выбірае і ўручае прафесійная супольнасць — вартасць іншая, адпаведна, і давер. І стымул для творчасці — самому стварыць нейкі тэатральны твор, пра які потым будзе гаварыць уся Беларусь.

Але гэта складана, лічаць у Міністэрстве культуры. Шырокае журы сабраць, прывезці ў Мінск, забяспечыць усім неабходным і магчымасцю працаваць на спектаклях — не так проста і арганізацыйна, і эканамічна. Таму, хутчэй за ўсё, менавіта так і будзе.

І яшчэ: у варыянце, які атрымаўся сёлета, **значна больш**

«Гамлет» Магілёўскага абласнога тэатра лялек.

задаволеных людзей тэатра. Задаволеных з пункту гледжання таго, колькі тэатраў атрымала хоць нешта. У нашых няпростых умовах існавання тэатраў (асабліва ў рэгіёнах) даволі вялікая падтрымка — як маральная, так і грашовая. Кожная асоба тэатра павінна верыць у тое, што яна можа быць адзначана такой прэміяй, калі не сёлета, то на наступны раз, і далей. Таксама стымул — праўда, іншага гатунку. Але трэба ж нейкім чынам прыдумваць **заахвочвальныя захады**, каб утрымліваць тых, хто служыць у тэатры сёння, нягледзячы на невялікія заробкі.

Вось толькі калі ўсё гэта пачыналася і задумвалася, аматары тэатра спадзяваліся на тое, што «Нацыянальная тэатральная прэмія» стане стымулам для якаснага штуршка, для актывізацыі тэатральнага руху, для развіцця тэатра ў Беларусі. Нават для з'яўлення новых твораў.

Але для з'яўлення твора трэба, каб яго напісаў аўтар. Нездарма ж традыцыйна на прэм'ерах гучыць: «Аўтара на сцэну!..» На жаль, у новым варыянце асоба аўтара з разгляду прэмій бадай што выпала. Аўтар балета «Князь Вітаўт» (кампазітар Вячаслаў Кузняцоў), на жаль, губляецца за стваральнікам харэаграфіі, хоць спектакль гэты трымаецца на музыцы. Тое ж з аўтарам мюзікла «Соф'я Гальшанская» Уладзімірам Кандрусевічам. Аўтары драматычных твораў наогул «выпадаюць» з разгляду, і тады якім чынам наша прэмія стымулюе з'яўленне пастановак з сучаснай драматургіяй? Не, цудоўна, што ў нас глядзяцца вельмі актуальна (і спектаклі гэта даказваюць!) Адам Міцкевіч («Пан Тадэвуш», «Дзяды»), Янка Купала («Раскіданае гняздо»), Уладзімір Караткевіч («Ладдзя роспачы»). Але ж ёсць шэраг драматургаў маладой фармацыі, якія працуюць цікава і ў іншых кірунках; ёсць тэатр аўтарскі, які скіраваны на эксперымент, можа быць не такі, да якога прывык шырокі глядач. І, хутчэй за ўсё, не прывыкне, калі не **ўпісваць і гэтую творчасць у сучасны айчынны тэатральны працэс**. А паводле «прэміі» — яе ў нас няма. Хоць, паводле жыцця, не ўсё так дрэнна.

Вось яно, рэальнае жыццё сучаснага тэатра, і цікавіць найбольш. І таму вынікі «Нацыянальнай тэатральнай прэміі» для мяне як для аматара тэатра сталі, хутчэй, правакацыяй. Спачатку — каб раскласці гэтую назву на тры часткі. І калі на першае месца выйшла слова «прэмія», якую падзялілі (дай Бог плёну лаўрэатам), то ў астатнім — слова за гледачом. Таму што частка пад назвай «нацыянальная» прадугледжвае актыўны ўдзел гледачоў, для якіх ствараюцца спектаклі, якія штосьці гавораць пра нас, беларусаў. Тое, што сапраўды важна для нацыянальнай культуры, ёсць яе грунт, альбо скіроўвае ў будучыню. Гэта спектаклі для нас. І наша задача цяпер: знайсці іх у прапанаванай праграме. Знайсці і паглядзець. Ніхто не замінае гэта зрабіць і зараз, калі ўсё скончана — спектаклі ідуць у тэатрах.

І яшчэ адна частка — «тэатральная». Вынікі журы — гэта ўсяго толькі **зварот у бок тэатральнага працэсу**. Зварот, пасля якога нараджаецца жаданне разабрацца ў ім самастойна і знайсці тое, за што ты сам можаш любіць тэатр. Такім чынам, цяперашняя Нацыянальная тэатральная прэмія стала правакацыяй для гледачоў: ісці ў тэатр і думаць пра тое, што ёсць у ім добрага. Шукаць гэта. Знайсці — і расказаць іншым. Лепшая прэмія для тэатра — поўныя залы на спектаклях. І як вынік — пра спектаклі гавораць.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Нотны радок

СУГУЧЧА ЧОРНАГА І БЕЛАГА

У міжнародным конкурсе піяністаў у Мінску пазмагаюцца прадстаўнікі 11 краін.

Цудоўны момант, каб наталіцца гучаннем фартэпіяна. «Фартэпіяна» — так называваўся конкурс напачатку, калі яго першы раз правялі ў 1996 годзе. Гэта гучна: прэстыж правядзення міжнароднага конкурсу ў нашай краіне падмацаваны яшчэ тым, што ён адбываецца раз у некалькі гадоў (далей у 2000, 2005, 2010 гадах), таму аматары музыкі яго сапраўды чакаюць. І гэта ціха: музыка, нават калі з'яўляецца для кагосьці момантам спаборніцтва, утварае інтымна-пачуццёвую прастору ў зале, дзе кожны слухач адчувае, што іграюць менавіта для яго. У прынцыпе, музыканты, нават калі маюць на ўвазе спаборніцтва, найперш выходзяць на сцэну дзеля таго, каб выступіць.

Гэта цудоўны момант, каб паслухаць музыку, калі ёсць на гэта час. Права адкрыць конкурс аддалі членам журы, якія 2 снежня выступілі на філарманічнай сцэне ў асобным канцэрце разам з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Рэспублікі Беларусь. Старшыня міжнароднага журы конкурсу — прафесар Беларускай акадэміі музыкі, народны артыст Беларусі Ігар Алоўнікаў. Але ёсць яшчэ прадстаўнікі беларускай фартэпіяннай школы: мастацкі кіраўнік Белдзяржфілармоніі Юрый Гільдзюк і Уладзімір Дулаў, лаўрэат міжнародных конкурсаў.

Цыкл конкурсных канцэртаў прадоўжыцца да 12 снежня. На ўсе выступленні праслухоўвання першага і другога тураў у залу Белдзяржфілармоніі можна трапіць абсалютна бясплатна. Слухаць ёсць што. У першым туры абавязкова гучаць толькі творы беларускіх кампазітараў: ад класікаў Станіслава Манюшкі, Напалеона Орды, Яна Тарасевіча да выдатных творцаў XX стагоддзя (Анатоля Багатырова, Генрыха Вагнера, Яўгена Глебава) і сучаснасці (Сяргея Картэса, Андрэя Мдзівані).

І слухаць ёсць каго: у конкурсе выступяць 50 музыкантаў ва ўзросце да 30 гадоў. Да фіналу, які заяўлены на 12 снежня, павінны дайсці толькі шасцёра.

Асобная падзея — канцэрт лаўрэатаў і закрыццё міжнароднага конкурсу піяністаў, які адбудзецца 13 снежня (вось на яго ўжо можна купляць квіткі). Урачыста, у вялікай зале Белдзяржфілармоніі, абвесцяць уладальнікаў прэмій. Першая падмацоўваецца сумай у 10 тысяч еўра, другая — 8 тысяч, трэцяя — пяць. Яшчэ тры прэміі па 2 тысячы еўра прадугледжаны для дыпламантаў. Пераможца выступіць у гэты вечар разам з аркестрам, уладальнікі другой і трэцяй прэмій сыграюць сола.

Мы маем на ўвазе, што збіраемся сачыць за спаборніцтвамі маладых музыкантаў свету, сярод якіх могуць быць і будучыя яркія «зоркі» ігры на фартэпіяна. Але заўсёды цікава паслухаць тых, хто прадстаўляе айчынную фартэпіянную школу, якая таксама выхоўвае выдатных музыкантаў. Праўда, на міжнародным конкурсе ў Мінску перамогу Беларусі здабыў ў 2000 годзе Аляксандр Музыкантаў. Сёлета нашу краіну прадстаўляюць больш за 20 маладых піяністаў, да якіх цікава прыглядзецца і прыслухацца. Хоць насамрэч для краіны важны сам факт правядзення міжнароднага конкурсу піяністаў, які б збіраў выканаўцаў высокага ўзроўню. Арганізатары, сярод якіх Міністэрства культуры Беларусі і Беларуская дзяржаўная філармонія, маюць на ўвазе адкрыццё новых яркіх імёнаў. З любой краіны. Але сваіх канкурсантаў падтрымаць усё ж варта. Няхай ім і сцены дапамагаюць.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Кінакрокі

ЯШЧЭ РАЗ ПРА КАХАННЕ

17 снежня беларускаму кіно споўніцца дзевяноста гадоў. Сугучна з гэтым ствараюцца і тэлевізійныя праекты, і нацыянальны конкурс на «Лістападзе», і адбіраецца залатая спадчына гісторыі беларускага кіно. А мы напярэдадні 17 снежня гаворым (і пасля таксама будзем) пра тэндэнцыі нацыянальнай кінаіндустрыі. Яна ў Беларусі жыве, дзейнічае, стварае і дае нагоду абмеркаваць яе функцыянаванне.

Камерцыйнае кіно, якое ў беларускай прасторы таксама мае сваю нішу, за час існавання кінематографа ніколі не здавала сваіх пазіцый. Магчымасць атрымаць буйны прыбытак нязменна прыцягвае ў кінастудыі таленавітых і не вельмі сцэнарыстаў, рэжысёраў, акцёраў.

Ёсць у сферы кінавытворчасці роднасная катэгорыя «дзяржаказ», для кінематаграфістаў — святая святых. Тут і грошы, і пачэсная служба на карысць краіны, і разнастайныя прывілеі. З таго самага вядомага «Кинематограф — важнейшее из искусств» кіно па-ранейшаму можа выконваць прапагандысцкія, рэкламныя, «богаўгодныя» функцыі. Да таго ж зарабляць грошы, ствараючы масавы *прадукт*, і беларускае кіно ў гэтым адзначылася — каб прыгожа выглядала і ўражвала традыцыйнымі напрацоўкамі папярэднікаў.

У гэты кантэкст уліліся рамантычна-прыгодніцкія камедыі — «Вось гэта каханне!» Станіслава Назірава, якую ўжо мільён разоў паказалі па тэлебачанні, «Нерэальнае каханне» Армана Геваргяна, якая ствараліся сумесна з беларускім прадзюсарам Глебам Шпрыгавым, «З 8 Сакавіка, мужчыны!» Арцёма Аксёненкі ад расійскай прадзюсарскай кампаніі і кінастудыі «Беларусьфільм». Назвы паспяхова адсылаюць да авантурнага, месцамі занадта сентыментальнага зместу, а фільмы прымушаюць задацца пытаннем, ці заўсёды бюджэт тоесны мастацкай каштоўнасці. Лічу неабходным нагадаць, што «Вось гэта каханне!», напрыклад, здымалася напярэдадні буйной спартыўнай падзеі — чэмпіянату свету па хакеі, што дакладна звязана з падабенствам сюжэта да вандроўкі па Беларусі. А «Нерэальнае каханне» здымалася перад Алімпійскімі гульнямі ў Сочы, таму і авантуры разгортваюцца амаль не на сочынскіх лыжах. Да праекта фільма «З 8 Сакавіка, мужчыны!» «Беларусьфільм» далучыўся з разлікам зарабіць, але не выйшла: на момант выхаду карціны ў пракат па зразумелых прычынах цалкам адваліўся ўкраінскі рынак, і агульная наведвальнасць кінатэатраў знізілася.

Непрыкрыта, але быццам ненадакучліва «Вось гэта каханне!» і «Нерэальнае каханне» прыцягваюць увагу да нашых краін (Беларусі і Расіі), паказваюць будучым турыстам мясцовыя краявіды, і адначасова забаўляюць лёгкім гумарам і рамантычнымі гісторыямі.

«Нерэальнае каханне» стваралася па асноўных правілах: персанажы інжэню і інтэлігентнага мужчыны, камедыйнасць, рамантычнасць, сентыментальнасць, прыгоды.

Адсюль напрошваецца правіла рэкламных кінапраектаў — ісці па пракладзеных дарожках банальных меладрам. Антаніёні-стайл тут не пройдзе. Рэклама — прадукт масавы, і фільм павінен прэтэндаваць на такое ж званне. На падобную карціну не лянота зайсці ў кінатэатр пасля цяжкага дня або паглядзець дома, седзячы ў крэсле. Ніхто не глядзіць для таго, каб расслабіцца, Мікеланджэла Антаніёні, з прозай жыцця не паспрачаешся.

А ўжо названыя фільмы — не проза, а суцэльная паэзія. Тут дабро атрымлівае перамогу над злом, непасрэднасць — над пыхай, каханне — над нянавісцю, і ўсё гэта на фоне беларускіх славутасцяў ці лыжных курортаў Сочы.

У карціне «Вось гэта каханне!» дзве амбіцыйныя, «арыентаваныя на Захад» масквічкі прыязджаюць на суткі ў Мінск. На шляху яны сустракаюць двух беларусафілаў, адзін з якіх — з галантнымі манерамі, мяккім голасам і пяшчотным позіркам прэтэндуе на героя рамантычнай гісторыі. Так яно і здарылася. Праслаўтая хімія зрабіла сваю справу і пакінула рваныя раны на сэрцы масквічкі і мінчаніна, але абставіны прымусілі іх расстацца. Суткі ў Мінску прадказальна расцягваюцца, але галоўнае — як. Знаходжанне дзяўчат у Беларусі ператвараецца ў падарожжа па краіне, з антуражам галоўных яе славутасцяў, культурных каштоўнасцяў і нацыянальных асаблівасцяў. Гэтыя прыгоды і сталі дэманстрацыяй Беларусі з пасылам: «У нас тут выдатна, прыязджайце». Пытанне толькі ў тым, наколькі ўдала фільм прадставіў нашу краіну.

Кадр з фільма «Вось гэта каханне!»

Карціна з'яўляецца пераможцам рэспубліканскага конкурсу кінапраектаў на вытворчасць нацыянальных фільмаў і фільмаў у рамках сацыяльна-творчых заказаў (не бачылі мы яшчэ «Мы, браты»). Сцэнарый напісаны Кірылам Сітнікавым, Вадзімам Галыгіным і Уладзімірам Мікулічам. Калі адну з задач фільма — за паўтары гадзіны прэзентаваць Беларусь — абмінуць было нельга, то да мастацкай каштоўнасці, мабыць, не паставіліся сур'ёзна. Што ж фільм распавядае пра нашу краіну?

Сцэнарысты выправілі дзяўчат у падарожжа па Дудутках, беларускай вёсцы, на рыцарскія баі ў Мірскі замак і на возера Нарач. Падарожжа суправаджаецца незвычайным эфектам ад глытка беларускай гарэлкі пад акампанемент «Касіў Ясь канюшыну», беларускай «трасянкай» і хвалёнай гасцінасцю, дзякуючы якой Маша і Карына — галоўныя гераіні — аказваюцца на каларытным вясковым вяселлі. Калі апынуліся ў вёсцы, то давялося і кароў падаіць, і свінней накарміць. Сена, гарэлка і каровы — наша ўсё. Ёсць дзе разгуляцца жартаўнікам. Варта аддаць належнае сцэнарыстам: у гумары фільма няма ні намёку на пошласць, якую шлейфам мог прынесці за сабой з Comedy Club Вадзім Галыгін. Аднак для эстэтычнага ўспрымання гледача/патэнцыйнага наведвальніка Беларусі ці лепшая гэта дэманстрацыя сапраўды беларускага? Або наша аграрнасць уваходзіць у лік славутасцяў нароўні з Мірам і Нясвіжам? Сумесь беларускай і рускай моў — так званая «трасянка» — несумненна, уласцівая беларусам, але ці варта гэта радасна выстаўляць напаказ? Жарты і персанажы, створаныя на аснове такіх беларускіх, але ўсё ж непрыметных рэчаў, падаюцца лубачнымі і прымітыўнымі. Тэма вёскі для гумарыстаў — багаты патэнцыял, але каму патрэбная гэтая паблажка да беларускіх жыццёвых рэчаў?

Сапраўды добра зроблены панарамныя віды начнога Мінска (сярод якіх відавочна рэкламным падаўся эпізод у казіно), папулярныя рыцарскія баі ў Мірскім замку, возера Нарач, велічнасць якога ў фільме змаглі ўдала падкрэсліць. Падарожжа — ідэя простая і цалкам удалая, але аграмка аляпаватая і грубая.

Непрыхаванай, але духаўздымнай рэкламай гучыць усклік Карыны ў начным клубе: «Какого черта ты называешь Минск Стокгольмом? Минск гораздо круче!». Кхм, як недарэчна было б параўноўваць Прагу і Парыж, таму што кожны горад самабытны і прыгожы, так не варта параўноўваць Мінск са Стакгольмам, прызнаючы тым самым магчымасць супастаўлення не на карысць нашай сталіцы. «Гучыць як кліна», — скажа нехта і будзе мець рацыю.

У канцы фільма раскрываецца сапраўдная мараль: харства Амерыкі і подлага Косціка (жаніха Карыны) апынулася лжывай і нікому не патрэбнай, затое абедзве галоўныя гераіні знайшлі ў Беларусі сваё каханне і сапраўднае шчасце. Косцік пакараны ўдарам у сківіцу ад «рэальнага» беларускага мужчыны. Выдатнай аказалася ўся Беларусь, асабліва на перыферыі, а подлае рассеялася па варожай Амерыцы і суседняй Расіі.

Спадзяемся, што не.

Фільм «Нерэальнае каханне» адносіцца да Беларусі пасродкава. У якасці прадзюсара выступае беларус Глеб Шпрыгаў, вядомы раней па карцінах ваеннай тэматыкі «У чэрвені 1941» і «На безыменнай вышыні», частку акцёрскага складу займаюць нашы акцёры ну і для здымак выкарыстоўваліся нашы пляцоўкі. Немудрагелістым чынам беларускія акцёры апынуліся ў ролі падпявал. У актыўна рэкламуемы праект па сцэнарыі дзівы з Рублёўкі Аксаны Робскі запрасілі вядомых Раўшану Куркову, Марыну Аляксандраву, Ягора Бяроева, Гошу Куцэнку і іншых. На ролі недарэчных мізэрных персанажаў (камедыя ж) запрошаны беларусы. Ад такой відавочнай іерархіі становіцца няёмка і крыўдна.

Былыя аднакласніцы — галоўныя гераіні — выпадкова сустрэліся праз дзесяць гадоў пасля школы. Няўпэўненая ў сабе, сціплая, рамантычная Света кантрастуе з напорыстай, рашучай, ашчаднай Вольгай. Кожная з іх у пошуках свайго шчасця, толькі ўяўляецца яно ім па-рознаму. Вольга бярэ пад сваё аўтарытэтнае крыло Свету і абяцае ёй багатага мужа. Каб дагнаць кандыдата на гэтую ролю, яны выратаваўшы ўсе грошы на самалёт.

У Сочы ім даводзіцца жыць за кошт хітрасці і выкрутлівасці Вольгі, якая таксама ў пошуках багатага жаніха. Так, сентыментальная камедыя раскрывае нам норавы «паляўнічых за кашалькамі», свет багатых мужчын і сочынскія краявіды. З'яўленне апошніх на шырокім экране было своечасовым: карціна выйшла ў пракат на пачатку Алімпійскіх гульняў, у гэты момант пра Сочы крычаў кожны прас. Карціна не акупілася, але Сочы праславіла. Глядач атрымаў задавальненне ад экраннага дзейства і пайшоў шукаць «прынцаў» і «прынцэс» у сапраўдным жыцці. Бо мараль «Нерэальнага кахання» рамантычная і старая як свет: сапраўдныя пачуцці даражэйшыя за грошы.

Мараль гэтая традыцыйна дакладная, аднак у працэсе кінавытворчасці яна часам ператвараецца ў безаблічны, выгадны прадзюсару спосаб, бо толькі так набывае папулярнасць у гледача. «Нерэальнае каханне» ствараліся па асноўных правілах: персанажы інжэню і інтэлігентнага мужчыны, камедыйнасць, рамантычнасць, сентыментальнасць, прыгоды.

Тыя ж правілы плюс містычныя з'явы выкарыстаны ў карціне

Марыя БЯРСЕНЕВА ў фільме расійска-беларускай вытворчасці «З 8 Сакавіка, мужчыны!»

Тайны і яўны сэнс камерцыйнага айчыннага кіно

«З 8 Сакавіка, мужчыны!», пра якую «Звязда» раней пісала асобна. Інжэню — дзяўчына з Мінска, якая прыязджае ў Маскву да сваёй сястры, эфектнай бландзінкі Ганны Беркутавай, якая можа чытаць мужчынскія думкі. Незвычайная здольнасць дапаможа ёй пайсці па правільнай дарозе жыцця і раставіць усё па сваіх месцах, гэта значыць у канцы фільма ўсё будзе «як трэба», прадказальна. У эпізадычных ролях таксама можна пазнаць беларускіх акцёраў. Галоўных персанажаў выконваюць вядомыя ў расійскай (суадносна, і ў нашай) медыйнай прасторы персоны. Няёмка-2.

Адсюль напрошваецца правіла рэкламных кінапраектаў — ісці па пракладзеных дарожках банальных меладрам.

Фільмы «Вось гэта каханне!», «Нерэальнае каханне» і «З 8 Сакавіка, мужчыны!» для сваёй нішы добрыя. Нічога, што занадта прадказальныя, сатканыя са штампаў, непераканаўчыя, — яны нічым не вылучаюцца, толькі папаўняюць калекцыю хутка згасаючых праектаў. Чакаць глыбакадумнасці ад карцін з рэкламнымі/забаўляльнымі амбіцыямі, напэўна, не варта. Аднак быў жа зняты як камерцыйны фільм «Сненанне каля Тыфані» з непараўнальнай Одры Хепберн, ці па дзяржаказе знакаміты «Матадор» Пэдра Альмадовара. Спадзевы на фільм такія: зарабіць грошай, дагадзіць заказчыку, «паварыцца» ў публічным мастацтве. Але на карысць гэта мастацтву ці не — вялікае пытанне. Ці на карысць гэта вобразу беларускага кінематографа? Так яно, мабыць, паказвае, што адкрыта для ўсіх кірункаў сучаснага кіно. Але паказальна, дырэктар «Беларусьфільма» Алег Сільвановіч сказаў, што кінастудыя больш не будзе ўдзельнічаць у праектах фільмаў кшталту «З 8 Сакавіка, мужчыны!». Якім будзе дзяржаказ «Мы, браты» — пакуль што невядома. Ці будзем мы вучыцца на гэтых капрадукцыях рабіць кіно? Спадзяюся, што не.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

08.01.2015 в 11.00 по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. № 204, по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на пять лет для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг. Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87

Адрес арендуемого имущества	№ лота	Площадь, кв.м	Коэффициент от 0,5 до 3,0	Начальная цена продажи, базовые арендные величины*	Размер задатка, базовые арендные величины*	Характеристика
Капитальное строение, гараж (принадлежность к зданию АТС-2), 1-й этаж, помещения Гродненская область, Лидский р-н, г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3	1	64,6	2,5	16,15 *	1,615 *	Помещения находятся на первом этаже одноэтажного кирпичного здания в центральной части города. В помещениях есть естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление. В здании имеется канализация, водоснабжение. Помещение площадью 64,6 кв.м является проходным. Вход в помещение площадью 15,8 кв.м осуществляется через помещение площадью 64,6 кв.м. Помещения находятся в удовлетворительном состоянии.
	2	15,8	2,5	3,95 *	0,395 *	
Капитальное строение, здание АТС-2, 3-й этаж, помещения, Гродненская область, Лидский р-н, г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3	3	41,2	2,0	10,3 *	1,03 *	Помещения находятся на третьем этаже четырехэтажного блочного здания в центральной части города. Лифт отсутствует. В помещениях имеется естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, телефонизированы. В здании имеется канализация, водоснабжение. Помещение площадью 41,2 кв.м проходное. Помещения находятся в удовлетворительном состоянии.
	4	70,4	1,0	17,6 *	1,76 *	

** Оплата в белорусских рублях, исходя из размера базовой арендной величины, установленной в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь на день оплаты.*

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа, о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц – резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет 3012000040071 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 500826567, Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 30 базовых величин.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. 202 с 08.12.2014 по 06.01.2015 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 06.01.2015, не рассматриваются.

Телефоны для справок: (0152) 606805, (0152) 606801, факс (0152) 72 02 07.

МАНСАРДНОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО

в Октябрьском районе города Минска

Во исполнение Указа Президента Республики Беларусь от 18.12.2007 № 657 «О некоторых вопросах реконструкции жилых домов»

УП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» определены жилые дома № 5, корп. 1 по ул. Воронянского, № 97, корп. 1 по ул. Казинца, на которых в 2015 году возможна надстройка жилых и нежилых помещений.

Заказчиком реконструкции является **УП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска».**

Реконструкцию жилых домов планируется производить одновременно с капитальным ремонтом и с письменного согласия большинства собственников. Для этого представителями УП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» будет осуществляться обход всех квартир, граждане которых являются собственниками жилых помещений, с целью определения их мнения.

В случае, если согласие собственников не будет получено в необходимом количестве, а жилой дом включен в Программу капитального ремонта жилищного фонда УП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» на период 2005–2015 годы, капитальный ремонт будет проводиться без выполнения надстройки.

УНП 100286730

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Универмаг «Солигорск» (продавец) проводит повторный открытый аукцион

по продаже здания магазина,

общ. пл. **341,1 кв.м,** инв. № 644/С-38264; охранно-пожарная сигнализация (4 единицы); многолетние насаждения (ясень – 2 шт., клен – 2 шт., кустарники живой изгороди, газон). Указанное имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 643000000001000047 площадью **0,0971 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, Солигорский район, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, д. 20А.**

Начальная цена с НДС – **1 955 990 160** бел. руб. (*стоимость снижена на 10%*).

Задаток 10% от начальной цены – 195 599 000 бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) рабочих дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.10.2014 г.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **19.12.2014** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.12.2014** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

Утерянные бланки квитанций 1-СУ № 8564209, № 8564210, принадлежащие ОАСО «Би энд БИ иншуренс Ко», **считать недействительными.**

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 15 января 2015 г. проводит открытый аукцион с условиями № 02-У-15 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены).
Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

